№ 30 (532) 16 жніўня 2007

www.nn.by

# Наша Ніва

П Е Р Ш А Я   Б Е Л А Р У С К А Я   Г А З Э Т А

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

# Апазыцыя згуртавалася

дзеля «Эўрапейскага маршу». Маніфэстацыя прызначаная на Пакроў, 14 кастрычніка.

У аўторак прайшла прэс-канфэрэнцыя заяўнікаў «Эўрапейскага маршу». За некалькі гадзінаў перад гэтым старшыня аргкамітэту па правядзеньні акцыі Віктар Івашкевіч падаў заяўку ў Менгарвыканкам. Заяўнікі просяць дазволіць правядзеньне шэсьця 14 кастрычніка (нядзеля) а 14.00. Маршрут наступны: ад Кастрычніцкай плошчы да Нацыянальнай бібліятэкі, дзе павінен прайсьці мітынг. **Старонка 4.**

## У НУМАРЫ

**Партыю судзяць за сайт**

У сераду ў Гаспадарчым судзе Менску пачаўся судовы працэс супраць Аб’яднанай грамадзянскай партыі. Прычына — публікацыя ў Інтэрнэце, якая кранае сына Л.Козіка. **Старонка 3.**

**Палітоляг Суздальцаў дзіўна захварэў**

Яго зьмясьцілі ў шпіталь расейскага Мінабароны, аднак ня могуць вызначыць дыягназ. **Старонка 3.**

**БТ даюць яшчэ больш**

Лукашэнка падпісаў указ пра дадатковую фінансавую падтрымку супрацоўнікаў Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі. **Старонка 5.**

**Месяц Беларусі**

Літаратурны фэстываль ў Брно ўразіў беларускіх аўтараў. Піша Наталка Бабіна. **Старонка 12.**

**Аджара**

Курорт, які эўрапеізуецца ў вас на вачах. Піша Сяргей Харэўскі. **Старонка 16.**

# Сьпёка скончаецца



Незвычайна цёплаю была вясна. Сапраўдная гарачыня стала ўжо ў траўні. А сапраўднае пекла пачалося ў ліпені, калі сыноптыкі паўжартам называлі называлі самым халодным Віцебск, дзе ртутны слупок сягаў +32 градусаў. Месцамі гарачыня ўздымалася да 40 градусаў. Былі пабітыя рэкорды веснавыя, пасьля ліпеньскія, цяпер — жнівеньскія.

14 жніўня ў самым паўночным абласным цэнтры Беларусі — Віцебску слупок тэрмомэтра падняўся да адзнакі +30,1 градуса. Ранейшы рэкорд, зафіксаваны ў 1939 годзе, складаў 29,5 градуса.

У Менску быў паўтораны рэкорд, зарэгістраваны ў 1939 годзе, — 29,6 градуса цяпла.

Небясьпечна стала ўжываць грыбы, нават улюбёныя лісічкі – у іх ад сьпёкі ўтвараецца шмат таксынаў. Няможна купацца ў шмат якіх вадаёмах, ды есьці азёрную рыбу. Рыбы пакутуюць да паразы-

**Працяг на старонцы 2.**

# Нацбанк адмаўляецца ад прывязкі да расейскага рубля

З 2008 г. курс беларускага рубля больш ня будзе прывязаны да расейскага. Гэта рашэньне ўключана ў праект асноўных кірункаў грашова-крэдытнай палітыкі на 2008 г.

Нацбанк мае выкарыстоўваць абменны курс беларускага рубля да даляра ЗША ў якасьці адзінага прамежкавага манэтарнага арыенціру грашовай палітыкі.

Пры гэтым у 2008 г. Нацбанк разьлічвае ўтрымаць абменны курс рубля да даляра ў межах +/-2,5%. Такі самы калідор прывязкі існаваў у 2007 г.

Важнасьць Расеі як стратэгічнага гандлёвага партнёра Беларусі зьмяншаецца. Гэтым тлумачыцца і адмова ад прывязкі да расейскага рубля.

**МБ**




PHOTO.BYMEDIA.NET

## Сьпёка сканчаецца

**Працяг са старонкі 1.**

таў і браку кіслароду. Цяжка й жабам.

Пацяпленьне заўважна шкодзіць хваёвым, гарадзкія дрэвы жоўкнуць без пары, лістота на іх радуе нас добра калі да сярэдзіны лета.

Сьпякота ня дала гэтым годам паласавацца вішнямі ды сьлівамі. У той жа час сялянаў цешыць ураджайнасьцю кукуруза, а таксама проса. Навукоўцы бачаць пэрспэктывы вырошчваньня ў Беларусі сорга. Гарачыня робіцца нормай: 7 з апошніх дзесяці летаў былі сьпякотнымі.

Цяжка даецца пацяпленьне клімату людзям з падвышаным ціскам ды хворым сэрцам. Ім прыходзіцца абмяжоўваць актыўнасьць, менш рухацца.

Беларусь не адзіная краіна, што сёлета цярпела ад апалаў. У Вугоршчыне загінула паўтысячы чалавек. Малдова просіць дапамогі праз вялізныя страты ўраджаю.

Ня варта, аднак, паддавацца апакаліптычным настроям. Такія незвычайна гарачыя сэзоны ўжо фіксаваліся ў нашай гісторыі.

**Сямён Печанко**

### КАЛЯНДАР

## Аляксандар Мікульчык

14 жніўня споўнілася 125 гадоў Аляксандру Мікульчыку — аўтару аднаго зь першых беларускіх гімнаў «Адвеку мы спалі».

Адвеку мы спалі, і нас разбудзілі,
Пазналі, што трэба рабіць,
Што трэба свабоды, зямлі чалавеку,
Што трэ лепшай долі здабыць.

Бо што ж то за марная доля такая —
Для іншых карысьці працуй.
Па нашых абшарах чужынец гуляе,
А ты ў родным краі гаруй.

Той Мікульчык быў просты рабочы: працаваў і грузчыкам, і перапісчыкам, і матросам. Шэсьць месяцаў ён адбыў у зьняволеньні ў час рэвалюцыі 1905—06 г., Жывучы ў Пецярбургу, Кіеве, друкаваўся ў «Нашай Ніве», іншых газэтах. Сьляды Мікульчыка губляюцца пасьля 1918-га. Песьня ж стала народнай. Яе аўтарства так і пазначалася. Пазьней яна прыпісвалася таксама Ўладзіславу Галубку. Гарманізаваў жа яе кампазытар Мікола Равенскі. Імя А.Мікульчыка вярнуў зь нябыту гісторык Аляксей Каўка.

**Шаноўныя людзі!**

«Наша Ніва» шукае распаўсюднікаў для продажу газэты на вуліцах і ў электрычках. Справа выгадная і надта патрэбная.

Продаж ажыцьцяўляецца на аснове дамоваў.

Зьвяртацца праз тэл.:
(017) 284–73–29,
(029) 260–78–32,
(029) 618–54–84.

Купала ў кожны дом




**Выйшаў першы плякат з сэрыі «Нацыянальныя героі Беларусі». Каб набыць, пытайцеся праз тэл. (029) 505-39-11 або праз e-mail: plakat@biz.by**

# Партыю судзяць за сайт

У сераду ў Гаспадарчым судзе Менску пачаўся судовы працэс на пазоў юргрупы «Аргументъ» да Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП). Прычына — публікацыя ў інтэрнэце.

30 ліпеня Гаспадарчы суд прыняў пазоў ААТ «Юрыдычная група «Аргументъ» пра абарону дзелавой рэпутацыі. Прычынай звароту ў суд зьяўляецца артыкул «Сям'я» робіць бізнэс. Пад надзейным дахам дзяржавы». На думку пазоўніка артыкул наносіць шкоду дзелавой рэпутацыі таварыства і яго заснавальніка Андрэя Леанідавіча Козіка, сына старшыні ФПБ. Прэтэнзіі выказваюцца да наступнай фразы: «Сын галоўнага лукашэнкаўскага прафсаюзьніка Леаніда Козіка стварыў юрыдычную фірму «Аргументъ», якая лабіруе інтарэсы замежных прадпрыемстваў і буйнага прыватнага бізнэсу ў дзяржструктурах. Фактычна выходзіць, што Андрэй Козік разносіць па высокіх кабінэтах грошы за той ці іншы подпіс».

Артыкул быў надрукаваны на сайце www.ucpb.org, які фактычна адлюстроўвае пазыцыю АГП. «Аргументъ» настойвае на тым, каб гэтая інфармацыя была зьняпраўджаная на вышэйзгаданым сайце і ў штотыднёвіку «Белорусы и рынок», які ня мае ніякага дачыненьня да публікацыі.

АГП у сваю чаргу цалкам адхіляе пазоў, як накіраваны



Андрэй Козік.

не да таго адказчыка, бо партыя не зьяўляецца ўладальніцай сайту www.ucpb.org. У АГП гавораць, што гэта не партыйны сайт, а рэсурс прыхільнікаў партыі і хостынг на яго належыць ня ім.

15 жніўня ў Гаспадарчы суд не зьявіліся прадстаўнікі пазоўніка, яны просяць перанесьці разгляд справы на 28 жніўня, бо цяпер знаходзяцца ў камандзіроўцы. Судзьдзя Нэлі Арлоўская палічыла гэту прычыну непаважнай.

Таксама судзьдзя папрасіла адказчыка прадставіць запіску з інфармацыяй аб тым, хто рэгіструе даменныя адрасы ў беларускім інтэрнэце і хто выдае ліцэнзіі. Відаць, па ўсім суд скончыцца ня скора.

За артыкул у інтэрнэце ў 2001 г. судзілі гарадзенскіх журналістаў Міколу Маркевіча і Паўла Мажэйку. За кратамі за публікацыю на тым жа сайце www.ucpb.org знаходзіцца палітык Андрэй Клімаў, суд над якім яшчэ не пачынаўся. Аднак яшчэ ніколі не было пазоваў да ўладальнікаў тых ці іншых сайтаў. Таму гэты судовы працэс стаў беспрэцэдэнтным.

**Зьміцер Панкавец**

# Палітоляг Андрэй Суздальцаў дзіўна захварэў

Яго зьмясьцілі ў шпіталь расейскага Мінабароны, аднак ня могуць вызначыць дыягназ.

5 жніўня расейскі беларусазнаўца Андрэй Суздальцаў на сваім сайце www.politoboz.com зрабіў наступны допіс: «Паважаныя сябры, калегі, наведвальнікі сайту. Цяжкая хвароба вырывае мяне, я спадзяюся, што толькі на нейкі час, з Вашых шэрагаў. Колькі дзён ці тыдняў зойме гэтая барацьба — невядома… Асабліваe прывітаньне маім недругам і ворагам. Для іх гэта добрая навіна…»

Зьявілася вэрсія, што палітоляг мог быць атручаны. Каб зьняць узьніклыя пытаньні, мы вырашылі патэлефанаваць непасрэдна Андрэю Суздальцаву ў Маскву.

Палітоляг відавочна ўзрадаваўся званку зь Менску, бо, паводле ягоных словаў, зь Беларусі даўно ўжо ніхто не тэлефанаваў. Сп. Суздальцаў пацьвердзіў, што ягоны стан насамрэч цяжкі, але больш нічога сказаць ня можа, бо пакуль дыягназ не паставілі самі дактары.

«Ужо тыдзень знаходжуся ў адным са шпіталёў Міністэрства абароны Расейскай Фэдэрацыі. Тут добрыя дактары і ўзровень мэдыцыны, аднак нават яны ня могуць зразумець, што са мной такое адбываецца. Па маім пытаньні прайшло ўжо два кансыліюмы — выніку ніякага. З прычыны таго што няма дыягназу, немагчыма пачаць і курс лячэньня. Аналізы вельмі кепскія. Нават ня ведаю, на які тэрмін выпаў з грамадзкага жыцьця і працы праз гэтую хваробу. Што тычыць чутак пра тое, што мяне маглі атруціць, то я іх катэгарычна хачу аспрэчыць. Вакол маёй асобы заўсёды хадзіла вельмі шмат чутак і легенд — гэта адна зь іх», — сказаў Суздальцаў.

**Зьміцер Панкавец**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Андрэй Суздальцаў у цягніку «Менск—Масква».

**Андрэй Суздальцаў**

нар. у Расеі, з 1993 жыў у Менску. У сакавіку 2006 быў пазбаўлены віду на жыхарства і дэпартаваны ў Расею. Яму на пяць гадоў забаронены ўезд на тэрыторыю Беларусі, бо ўяўляе сабой «пагрозу нацыянальнай бясьпецы Беларусі». У Менску засталася жонка Суздальцава, а таксама двое дзяцей.

А.Суздальцаў зацята крытыкуе беларускія ўлады з пазыцыі расейскіх інтарэсаў.

# Апазыцыя згуртавалася дзеля «Эўрапейскага маршу»

Маніфэстацыя прызначаная на Пакроў, 14 кастрычніка.

У аўторак ва ўправе Партыі БНФ прайшла прэс-канфэрэнцыя заяўнікаў «Эўрапейскага маршу». За некалькі гадзінаў перад гэтым старшыня аргкамітэту па правядзеньні акцыі Віктар Івашкевіч падаў заяўку ў Менгарвыканкам. Заяўнікі просяць дазволіць правядзеньне «Эўрапейскага маршу» 14 кастрычніка (нядзеля) а 14.00. Маршрут шэсьця наступны: ад Кастрычніцкай плошчы да Нацыянальнай бібліятэкі, дзе павінен прайсьці мітынг.

«Сталасьць улады будзе вымярацца гатоўнасьцю да кампрамісу», — адзначыў каардынатар «Хартыі' 97» Саньнікаў. Яго падтрымаў лідэр АГП Анатоль Лябедзька:

«Мы мусім мець добрыя адносіны ня толькі з Расеяй, але з Захадам. Праўда, дзеля гэтага патрэбны канкрэтныя дзеяньні, бо нельга ціснуць адну руку, калі другая трымае ключы ад вязьніцаў, дзе сядзяць Казулін і Дашкевіч».

Аляксандар Мілінкевіч назваў «Эўрапейскі марш» «акцыяй са знакам якасьці». «Ён будзе сымбалізаваць вяртаньне Беларусі ў Эўропу. Перад намі стаіць пытаньне цывілізацыйнага выбару: ці мы будзем будаваць новую Бізантыйскую імпэрыю, ці ўключымся ў эўрапейскія інтэграцыйныя працэсы». І ён дадаў: «Зарана гаварыць пра сьмерць аб'яднанай апазыцыі, калі мы ў стане праводзіць такія акцыі разам».



PHOTO.BYMEDIA.NET

Маніфэстацыя пройдзе ў дзень, калі вернікі сьвяткуюць Пакроў. Гэта дзень малітваў да Маці Божай, просьбаў аб нябесным заступніцтве.

Сацыял-дэмакрат Мікола Статкевіч кажа, што «Эўрапейскі марш» у нейкай ступені стане адказам на агрэсіўную палітыку, якую апошнім часам вядзе супраць Беларусі Расея.

«Балянс між Захадам і Ўсходам ужо немагчымы, мы прапусьцілі гэты момант. Любы паварот Беларусі ў бок Эўропы Расея палічыць варожым для сябе. Таму цяпер выбар вельмі просты: Эўропа ці Азія», — сказаў Статкевіч.

Аргкамітэт стварыў перамоўную групу ў складзе старэйшынаў — Марыніча, Багданкевіча, Хадыкі, — якія будуць хадзіць па дзяржаўных установах і пераконваць даць дазвол.

Амаль усе заяўнікі адзначалі, што адной з галоўных тэмаў «Эўрапейскага маршу» стане пытаньне ўвядзеньня шэнгенскіх візаў краінамі, што мяжуюць зь Беларусьсю, а таксама іх кошту. «Мы будзем весьці перамовы пра гэта ў розных эўрапейскіх структурах. Для нас важна, каб як мага болей людзей бачыла заходняе жыцьцё», — кажа А.Мілінкевіч.

Правядзеньне ж «Сацыяльнага маршу», заплянаванага на канец верасьня, адкладваецца. Магчыма, на 11 лістапада.

**Зьміцер Панкавец**

## СЬЦІСЛА

### Левыя бяз права

Саюзу левых партый адмовілі ў рэгістрацыі. Мін'юст спаслаўся на частку 3 арт.17 Закону аб палітычных партыях. Матывуючы рашэньне пра адмову ў рэгістрацыі, міністэрства спасылаецца на фармальныя недакладнасьці. Прыкладам: «Калі ў выпісцы з пратаколу пры адлюстраваньні складу прысутных разьмешчана слова «Прысутнічае»... то ў самім пратаколе — слова «Прысутнічаюць».

### Налёт амону на пікнік

11 жніўня незарэгістраваны рух «За Свободу!» ладзіў пад Заслаўем пікнік. Прысутнічала каля трохсот чалавек. Мерапрыемства пачалося сьпяваньнем гімну «Магутны Божа», потым былі круглыя сталы, спартовыя мерапрыемствы, увечары — канцэрт з удзелам бардаў і рокераў. Пад заслону зьявіўся аўтобус з амонам. Міліцыя затрымала машыну з гукаўзмацняльнай апаратурай, у кіроўцы забралі правы. Астатнім удзельнікам перашкодаў не чынілі. Мілінкевіч ацаніў сход як удалы: «І спорт, і музыка, і арганізацыйны сход руху мы яшчэ раз правялі».

### Маладафронтавец вярнуўся ў Беларусь

Аляксей Янушэўскі пакінуў краіну напярэдадні суду над «Маладым фронтам» сёлета ў траўні. Увесь гэты час ён жыў у Празе ў бацькі. Хлопец абяцаў, што ў выпадку, калі суд скончыцца штрафам ці ўмоўным пакараньнем, ён вернецца на радзіму. У выніку суду Янушэўскі атрымаў 30 базавых велічынь штрафу.



**ЗП; СМ**

# «Панарама» выкрыла чарговую змову

У нядзелю, 12 жніўня, Першы нацыянальны канал у перадачы «Панарама тыдня» адзначыўся новым выкрывальніцкім фільмам — «Сеціўная вайна». Аўтар рэпартажу, Юры Пракопаў, распавядае пра тое, што адразу пасьля правалу «менскага майдану» ў 2006 годзе «пад дахам Дзярждэпартамэнту ЗША і спэцслужбаў» пачалі выпрацоўваць новыя мэтады барацьбы зь беларускай уладай.

У гэтую вайну ўключаныя дзясяткі недзяржаўных арганізацый, розныя рухі, фонды, праваабаронцы, СМІ, моладзевыя, жаночыя, рэлігійныя, прафсаюзныя арганізацыі. Усе разам яны ўтвараюць агульную сетку, якая пакрывае краіну. За мэту яны маюць «сацыяльныя выбухі з мноствам ачагоў узгараньня». Гэта і мусіць прывесьці да рэвалюцыйнай сытуацыі ў Беларусі.

Пракопаў кажа, што сеціўная вайна супраць Беларусі вядзецца пры падтрымцы суседніх дзяржаў. У гэты час у кадрах пачынаюць зьяўляцца сьцяг Польшчы і герб Літвы. «Дзясяткі фондаў укладваюць у сеціўную вайну мільёны даляраў», — рэзюмуе БТ.

Аднак Беларусь ня ёсьць канчатковай мэтай для амэрыканцаў, іх погляды накіраваны на Ўсход, на Расею. Менавіта ў рамках «сеціўнай вайны» ў Расеі прайшлі нядаўнія «Маршы нязгодных», мяркуе Пракопаў.

**ЗП**

# БТ даюць яшчэ больш грошай

Аляксандар Лукашэнка падпісаў указ пра дадатковую фінансавую падтрымку супрацоўнікаў Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі. Згодна з падпісаным дакумэнтам, бюджэтная частка заробкаў працаўнікоў кампаніі ўваднaчасьсе павышаецца на 40%.

Указ №384 ад 9 жніўня 2007 г. быў падпісаны кіраўніком дзяржавы «ў мэтах далейшага ўдасканальваньня ўмоў ажыцьцяўленьня дзейнасьці ў галіне тэлерадыёвяшчаньня й узмацненьня дзяржаўнай падтрымкі працаўнікоў НДТРК». Гэтым дакумэнтам уносяцца істотныя зьмены ва Ўказ прэзыдэнта № 125 ад 1997 г. «Пра выплаты стымуляцыйнага характару працаўнікам НДТРК».

Цяпер старшыні тэлерадыёкампаніі даецца права накіроўваць бюджэтныя сродкі як на ўсталяваньне стымуляцыйных надбавак, так і на прэміяваньне супрацоўнікаў. Як сказана ва ўказе, на ўсталяваньне надбавак стымуляцыйнага характару старшыня НДТРК можа накіроўваць да 20% ад памеру плянавага фонду заработнай платы і столькі сама — на прэміяваньне.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Галоўны ідэоляг краіны Алег Праляскоўскі ганаруе прэміяй «Тэлевяршыня» кіраўніка АНТ Ягора Хрусталёва.

Такім чынам, доля бюджэту НДТРК адразу можа пацяжэць (і, хутчэй за ўсё, найбліжэйшым часам пацяжэе) адразу на 40%.

Варта таксама адзначыць, што ўсяго два тыдні таму ўрад выдаў пастанову пра ўзмацненьне фінансавай падтрымкі Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі, ЗАТ «Другі нацыянальны канал» і ЗАТ «Сталічнае тэлебачаньне». Згодна з рашэньнем ураду, для кампаній быў усталяваны павышаны каэфіцыент (2,2) гранічнага нарматыву тарыфнай стаўкі першага разраду, што азначае дазвол на павышэньне больш як удвая службовых акладаў усіх супрацоўнікаў. Цяпер ад памеру гэтых падвойных акладаў НДТРК зможа фармаваць памер стымуляцыйных надбавак і прэміяльных. Калі падлічыць, выходзіць, што зарплата асобных супрацоўнікаў Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі можа вырасьці нават у 3 (!) разы.

**Паводле «Ежедневника»**

# Тэндэр на абсталяваньне «Белсату»

9 жніўня аб'яўлены тэндэр на закупку абсталяваньня для спадарожнікавага тэлеканала «TV Беларусь» («Белсат»). Заяўкі на ўдзел у тэндэры можна падаваць на працягу 46 дзён, затым будзе праведзены конкурсны адбор пастаўшчыка. Мяркуецца, што ў Беларусі на канал будуць працаваць больш за 30 журналістаў, у Варшаве — яшчэ 42. Запуск каналу заплянаваны на канец году.

# Студэнтаў ЭГУ выклікаюць у КДБ

Спачатку ў КДБ выклікалі студэнтаў-каліноўцаў. Цяпер цягаюць і студэнтаў Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту (Вільня). З розных канцоў краіны надыходзяць весткі пра гэта.

«Мяне запрасілі ў КДБ на размову. Я адмовіўся — яны прышлі ўтрох, нахамілі мне і маці й позву ўсё ж такі ўручылі. Размову са мною вядзе Н., маёр КДБ, у якога заўсёды чамусьці трасуцца рукі. Падчас размовы мае дурацкую звычку прымружвацца, ад чаго складаецца ўражаньне, што гэтак па-калгаснаму сьцябецца. Размовы адбываюцца на Камсамольскай, 28, Бюро прапускоў КДБ, — піша на сваім блогу нехта пад псэўданімам paul_broom. — Як выявілася, маёр Носаў звышнекампэтэнтны кадэбэшнік. Не захацеў даваць свой службовы нумар тэлефону падчас уручэньня позвы, хаця ён быў надрукаваны ў позьве; хадзіў некуды кансультавацца, ці маю я права забраць сваю позву па канцы размовы, прычым ня проста забраць, а каб там адзначылі, колькі часу я там прабавіў. На мой аргумэнт, што забраць позву я магу, яна ж мая, Носаў адказаў, што яна не мая, і сышоў хвілін на 15 кансультавацца.

На пытаньне, чаму мяне выклікалі, ён адказаў: каб я даў тлумачэньні свайго знаходжаньня ў Літве.

Далей: як даведаўся пра ЭГУ? Як паступіў? Хто дэкан? Хто кіруе праграмай? Дзе жывем? З кім жыву? Ці чуў я ад выкладчыкаў ЭГУ антыбеларускія выказваньні й заклікі да зьвяржэньня канстытуцыйнага ладу ў Беларусі? Як атрымліваю стыпэндыю? Ці прасілі Вас правозіць носьбіты інфармацыі праз мяжу? Ці былі ўчыненыя супраць мяне кампрдзеяньні?

Што такое кампрдзеяньні (кампраматуючыя дзеяньні), я ня ведаю. Ці лічыць размову з прадавачкай у краме пра вучобу? Вядома ж, я вазіў дыскі праз мяжу.

Выпісаў Носаў Уладзімер Анатольевіч мне другую позву на панядзелак. Сказаў, каб падумаў два дні і ўсё ж такі пагадзіўся на «канструктыўны дыялёг», ад якога я адмаўляюся.

Позва — гэта звычайны тэкст, надрукаваны на аркушы паперы А4, унізе якога ты распісваесься. Яна рвецца на дзьве часткі, і сама позва мае застацца ў цябе (верхняя частка), а карэньчык позвы застаецца ў кадэбэшніка (ніжняя частка), як пацьверджаньне таго, што ты яе атрымаў. У нашай сытуацыі з Носавым сталася наадварот. Сабе ён пакінуў на мяне выпісаную позву (в.ч), а мне аддаў якраз гэты карэньчык (н.ч.)».

## СЬЦІСЛА

### Кожны трэці першакурсьнік у БДУ — мянчук

Самы высокі конкурс сёлета ў БДУ быў на спэцыяльнасьць «дызайн». Ён склаў 14,8 чалавекі на месца. Высокім застаецца конкурс на «міжнародныя адносіны» — 10,2, «міжнароднае права» — 10. Усяго сёлета ў галоўную ВНУ краіны залічана амаль 6 тысяч студэнтаў, зь якіх на дзённую бюджэтную форму навучаньня — 1869, на дзённую платную — 2452, на завочную бюджэтную — 345, на завочную платную — 1093, замежнікаў — 201. 68% зь іх — кітайцы. Менчукоў сярод першакурсьнікаў 36%.

### Цяжкая спадчына Сталіна

Менскі гарадзкі суд пастанавіў не заводзіць справы супраць Вышэйшай атэстацыйнай камісіі паводле скаргі гісторыка Ірыны Кашталян. Спадарыня Кашталян лічыць, што ВАК не зацьвердзіў яе кандыдацкую дысэртацыю, прысьвечаную пэрыяду рэпрэсій, з палітычных прычынаў. Скаргу І.Кашталян у Менскім гарадзкім судзе разглядалі меней за 10 хвілін.

### Каб іншыя баяліся

9 жніўня Гаспадарчы суд Гомельскай вобласьці прызнаў арганізатараў канцэрту беларускамоўных бардаў вінаватымі ў ажыцьцяўленьні незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасьці. Ларысе Шчыраковай і Зьмітру Жалезьнічэнку неабходна выплаціць штраф 10 базавых велічынь (310 тысяч рублёў).

Такая цана арганізацыі адзінага за доўгі час у горадзе беларускамоўнага канцэрту.

**МБ**

### Рэдактара «Сов.Белоруссии» ўзнагародзілі ордэнам Скарыны

Указ аб узнагародзе А.Лукашэнка падпісаў 9 жніўня.

**БелТА**

### Адстаўны палкоўнік хоча ўсталяваць помнік Купалу

Палкоўнік у адстаўцы Антон Сабалеўскі, які жыве ў Маскве, яшчэ ў 2004 годзе за ўласныя грошы набыў і перадаў у Глыбоцкі музэй 70-сантымэтровую выяву Купалы. Гэта праца знакамітага скульптара Валяр'яна Янушкевіча. Цяпер ураджэнец Глыбокага прапанаваў раённым уладам паставіць яе ў выглядзе помніка. «Хутка перабяруся сюды, — тлумачыць масквіч, — тут радня. Купала добра пасаваў бы ў Глыбокім».

В.Янушкевіч даў згоду на распрацоўку праекту помніка. Ёсьць папярэдняя згода некаторых банкаў на фінансаваньне гэтага праекту.

**Галіна Баравая, BulletinOnline.org**



**Рэпарцёр газэты «Белорусы и рынок» Генадзь Барбарыч уганараваны прэміяй імя Завадзкага «За журналісцкую мужнасьць і прафэсіяналізм». Разам зь ім адзначаныя Анатоль Гатоўчыц з Гомеля і Натальля Макушына з Горадні.**

# Былы галкіпэр аб’явіў сябе ахвярай рэжыму Лукашэнкі



Былы брамнік зборнай Беларусі па футболе Валеры Шанталосаў у мінулую суботу зьвярнуўся з адкрытым лістом праз «Комсомольскую правду в Новосибирске».

Шанталосаў лічыць, што заведзеная супраць яго крымінальная справа па артыкуле 253 КК «Подкуп удзельнікаў прафэсійных спаборніцтваў» ёсьць палітычным заказам. А калі больш дакладна, то — «помста праваахоўных органаў, галоўнага рэдактара «Прессбола» Ўладзімера Беражкова і арганізатара-выканаўцы Генадзя Туміловіча».

Шанталосаў занепакоены, што ўзьнікла пагроза спачатку палітычнай, а пасьля фізычнай расправы над ім. Брамнік расказвае, што на працягу апошніх двух з паловай гадоў яму і ягонай сям’і неаднаразова тэлефанавалі з пагрозамі. А дачку Шанталосава выгналі з унівэрсытэту за «вальнадумства, выражэньне сваёй пазыцыі і меркаваньняў».

Заўзятары на форумах сустрэлі заявы Шанталосава з доляй скептыцызму.

**Зьміцер Панкавец**

# Пазьняк: Беларусаў пачнуць перасяляць у Расею



Лідэр КХП-БНФ Зянон Пазьняк у сваім новым артыкуле перасьцерагае, што Масква мае на мэце новы плян у дачыненьні да Беларусі.

«Так званая «пакрокавая тактыка» пуцінскай інтэграцыі Беларусі і Расеі часова адкладзена ў бок. Цяпер Масква ўжывае мэтодыку «пакрокавай прыватызацыі» Беларусі, сутнасьць якой палягае ў рэсурсным шантажы Лукашэнкі, запалохваньні яго і заганяньні ў кут, стварэньні пагрозы ягонай уладзе з мэтай прымусіць расплочвацца за шантаж нацыянальнай маёмасьцю Беларусі, заводамі, фабрыкамі, прадпрыемствамі, нерухомасьцю і ўрэшце — зямлёй», — піша Пазьняк.

Наступным этапам захопу беларускай маёмасьці, на думку лідэра КХП-БНФ, будзе перасяленьне беларускага насельніцтва ў Расею для працы ў расейскай прамысловасьці, здабычы, будаўніцтве. Пазьняк кажа, што ня трэба да гэтага адносіцца легкадумна, бо «Расея — гэта такая краіна, дзе здольныя ўвасобіць любыя шызафрэнічныя задумкі».

Пазьняк перакананы, што новы плян Масквы быў прапрацаваны на Захадзе, дзе яго ўспрымаюць як належнае. «Мы павінны спыніць маўчаньне пра дзеяньні Захаду, у прыватнасьці, Эўразьвязу», — перакананы палітык.

**Лявон Максюта**

## СЬЦІСЛА

### Збор подпісаў за вуліцу Брыля

Яго пачало Таварыства беларускай мовы. Кіраўніцтва ТБМ ужо зьвярталася да старшыні Менгарвыканкаму з адпаведнай прапановай, аднак адказу так і не атрымала. Старшыня ТБМ Алег Трусаў наважаны сабраць ня меней як 10 тысяч подпісаў.

### Тэракт на расейскай чыгунцы

Хуткі цягнік Масква-Пецярбург пацярпеў аварыю ў панядзелак вечарам у Наўгародзкай вобласьці. Пацярпелі 60 чалавек, больш за 30 былі шпіталізаваныя, ахвяр няма.

Выбухоўка была закладзеная ў 30 мэтрах ад мосту і пазьбегнуць больш сур’ёзнага здарэньня ўдалося дзякуючы таму, што цягнік ішоў на вялікай хуткасьці (каля 190 км/г), і пасьпеў праскочыць мост і не зваліцца ў раку.

Паводле папярэдніх высноў спэцыялістаў па выбухах, якія працуюць на месцы здарэньня, на чыгуначным палатне адбыўся выбух бомбы магутнасьцю да двух кіляграмаў у трацілавым эквіваленце.

**МБ**

# Іліеску перад судом



Былога прэзыдэнта Румыніі вінавацяць у жорсткім разгоне студэнцкай дэманстрацыі 17 гадоў таму. Сьледзтва працягвалася 2 гады. На падставе паказаньняў сьведкаў і рассакрэчаных урадавых дакумэнтаў пракуроры даказалі, што былы прэзыдэнт выдаў загад прывезьці шахцёраў у сталіцу з мэтай «ачышчэньня» Унівэрсытэцкай плошчы ад дэманстрантаў.

Пратэстуючыя некалькі тыдняў пад унівэрсытэтам студэнты й інтэлектуалы дамагаліся адстаўкі ўраду, у які ўвайшлі былыя намэнклятурнікі Мікалае Чаўшэску. У сталіцу прыехала 5 тыс. гарнякоў, якія «наводзячы парадак», забілі 7 чалавек, некалькі дзясяткаў паранілі й зьнішчылі офісы апазыцыйных газэт.

Працэс былога прэзыдэнта, які каардынаваў акцыю, пачнецца ў сярэдзіне верасьня ў Вышэйшым судзе Румыніі. Іліеску віны не прызнае.

# Нафтаперапрацоўка на мяжы стратнасьці

Чысты прыбытак Мазырскага НПЗ скараціўся ў параўнаньні зь мінулым годам у 30 разоў.

Нафтаперапрацоўчыя прадпрыемствы, якія яшчэ летась былі асноўнай крыніцай паступленьня валюты ў бюджэт, перажываюць цяжкія часы. Прыбыткі скараціліся ў дзясяткі разоў. Так, па выніках першага паўгодзьдзя чысты прыбытак на Мазырскім НПЗ і наваполацкім «Нафтане» склаў $3,8 і $26 млн. Для параўнаньня — у мінулым годзе мазырчукі зарабілі $120 млн. Прадпрыемствы вымушаныя браць дарагія крэдыты на закупку сыравіны. Пра тэхнічнае пераўзбраеньне гаворка й не вядзецца. На НПЗ не выключаюць магчымасьці вымушанага продажу прадпрыемстваў пры захаваньні сёньняшняй сытуацыі, паведамляе газэта «Белорусы и рынок».

Заводы працуюць на поўную магутнасьць, але рэнтабэльнасьць вытворчасьці пры гэтым застаецца надзвычай нізкай. Прычына хаваецца ў падвышэньні экспартных мытаў на нафту (цяпер складае 223,9 $/т) і вывазных мытаў на нафтапрадукты (163,2 і 87,9 $/т сьветлых і цёмных нафтапрадуктаў адпаведна). Падвысілася таксама й стаўка расейскага спэцыяльнага мыта на пастаўку нафты — з 58,6 да 65,6$/т. Па словах беларускіх чыноўнікаў, дзяржсубсыдыі ў памеры 90% ад спэцыяльнага мыта на нафту, якую атрымліваюць усе перапрацоўшчыкі нафты ў Беларусі, ужо недастатковыя для кампэнсацыі стратаў.

Беларусь чакаюць сюрпрызы з пастаўкамі нафты і ў наступным годзе. Гаворка вядзецца пра выкананьне ў наступным годзе так званага нафтавага балянсу. Сёлета ён складае 21,5 млн. т. Аднак праз тое, што расейскія партнэры палічылі нерэнтабэльным пастаўкі нафты па чыгунцы, а такім чынам у Беларусь мусіла патрапіць каля 4 млн. т., выкананьне заданьня робіцца праблематычным. Адзін з прапанаваных спосабаў выйсьця зь няпростай сытуацыі дужа не падабаецца Беларускай чыгунцы — скарачэньне тарыфаў на трансфармаваньне.

**Сямён Печанко**

# «Мотавела» аддаюць пераапранутым расейцам

Аўстрыйска-расейская фірма «ATEC Holding Gmbh» у 2007—11 гадах набудзе акцыі ААТ «Мотавела» на 15,6 млрд. рублёў. Адпаведнае рашэньне ўтрымліваецца ва ўказе прэзыдэнта №354.

На менскае прапрыпрыемства прэтэндавалі таксама айчынны «Амкадор» і расейская кампанія.

Справай зацікавілася аўстрыйская прэса. І высьветліла, што заснавальнік і кіраўнік «АТЕС» Аляксандар Мураўёў мае расейскае паходжаньне. У Аўстрыі ён атабарыўся некалькі гадоў таму. У Беларусі фірме належыць большая частка акцыяў у «Гуце Ялізава». Да 2009 г. «АТЕС» мяркуе збудаваць пад Смалявічамі фабрыку ліставога шкла.

**МБ**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Рабочыя ММВЗ падчас страйку. Фота з архіву «НН».**

## СЬЦІСЛА

### Намесьнік міністра сельскай гаспадаркі абараняе навукоўцаў

Намесьнік міністра сельскай гаспадаркі і харчу Васіль Паўлоўскі мяркуе, што беларускія гатункі збожжавых маюць патэнцыял амаль удвая большы за сёньняшні, але дзеля яго рэалізацыі трэба жорстка прытрымлівацца тэхналягічных патрабаваньняў. Пры гэтым ён высока ацаніў працу айчынных навукова-практычных цэнтраў. Варта адзначыць, што падчас візыту ў Гервяты Аляксандар Лукашэнка раскрытыкаваў беларускіх навукоўцаў.

### Калійная соль даражэе

«Беларуская калійная кампанія» мае ўзьняць кошты на калійныя ўгнаеньні на 30 даляраў за тону для Паўднёва-Ўсходняй Азіі. Такім чынам, ад 1 кастрычніка 2007 г. кошт адной тоны складзе 330 даляраў.

### Аршанскі піўзавод пойдзе з малатка

Аршанскі піваварны завод мае патрапіць на аўкцыён. Гэтае пытаньне павінен разгледзець гаспадарчы суд Віцебскай вобласьці 27 жніўня. Прадпрыемства мае крэдыторскую запазычанасьць больш як 12 млрд. рублёў без уліку пені, што перавышае яго балянсавы кошт. На сёньня завод знаходзіцца ў ахоўным пэрыядзе, 1 жніўня прызначаны яго часовы кіраўнік.

### Цукровікі шукаюць збыту

Сяляне вырасьцілі на мільён тонаў цукровых буракоў больш, чым складае патрэба цукровых заводаў. Цяпер шукаюцца замежныя пакупнікі на лішак ураджаю. Праект вытворчасьці біяпаліва з цукровікаў дагэтуль нераспрацаваны.

### Малдова на мяжы крызісу

Страты ад сушы перавысілі чацьвертую частку валавога ўнутранага прадукту рэспублікі і складаюць больш за мільярд даляраў. Малдаўскія палі нагадваюць пустыні, а вінаграднікі пажоўклі. Улады Кішынёва зьвярнуліся да міжнароднай супольнасьці за харчовай дапамогай.

**СП**

## 7 жніўня

### Казулін 500 дзён

7 ліпеня споўнілася 500 дзён, як былы кандыдат на пасаду прэзыдэнта **Аляксандар Казулін** знаходзіцца ў турме. Дачка палітвязьня Юлія заявіла пра ціск на бацьку з боку адміністрацыі калёніі і кепскі стан яго здароўя.

### Не адзін Мірон у Віцебску

Бел-чырвона-белы сьцяг быў узьняты ў цэнтры Віцебску на мачце антэны мабільнай сувязі. Праз паўгадзіны яго зьнялі пажарнікі. Міліцыя затрымала пабач з будынкам васемнаццацігадовага маладзёна, якога лічыць за легендарнага **Мірона**. Аднак першы сьцяг у Лёзна, за які ўзяў на сябе адказнасьць Мірон, быў вывешаны больш за 11 гадоў таму.

### Двое затрыманыя, чатыром удалося схавацца

Пасьля 16-й ў Менску на культурніцкай акцыі, прысьвечанай 490-й гадавіне выданьня ў Празе «Псалтыра» Францыска Скарыны, затрыманыя шэсьць сябраў Моладзі БНФ.

Маладыя людзі ўскладалі кветкі да помніка Скарыну ля Нацыянальнай бібліятэкі, а таксама зладзілі пэрформанс. На іх наляцелі два міліцыянты, сталі лавіць.

Пратрымаўшы паўтару гадзіны ў пастарунку, маладых людзей без тлумачэньня прычынаў выпусьцілі.

### Абараняць палітвязьняў

Менгарвыканкам адмовіў актывістам руху «За Свабоду» ў правядзеньні пікетаў у падтрымку палітвязьняў. Нібыта на месцы плянаваных пікетаў будуць праводзіцца працы па падрыхтоўцы да сьвяточных мерапрыемстваў, прысьвечаных 940-годзьдзю Менску.

## 8 жніўня

### Грышчэня і Азарка

Баранавіцкі актывіст **Яраслаў Грышчэня** пераведзены са статусу падазронага ў абвінавачаныя. Матэрыялы справы складаюць 143 старонкі, тры відэадыскі і 76 рэчдоказаў. У Грышчэні ўзялі падпіску пра нявыезд. Справу пераняў новы сьледчы — **В.Паўлоўскі**. Хлопца абвінавачваюць у дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт».

### Азарку будуць судзіць

Маладафронтаўцы **Насьце Азарцы** таксама выстаўлена афіцыйнае абвінавачаньне ў крымінальнай справе, распачатай КДБ за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі. Сьледчы ў Менскай абласной пракуратуры паведаміў ёй, што цягам месяца можа адбыцца суд. Будзе ён у Нясьвіжы.

### Шыдлоўскаму дадалі

Суд Партызанскага раёну Менску прыгаварыў моладзевага актывіста **Аляксея Шыдлоўскага** да 5 сутак адміністрацыйнага арышту па арт. 17.1 КаАП (дробнае хуліганства). «Нахуліганіў» ён нібыта 24 ліпеня. Тым часам А.Шыдлоўскі 25 ліпеня ўжо быў асуджаны на 15 сутак за аналягічнае правапарушэньне, учыненае ім нібыта ў той жа дзень.

### Партыі БЭЗ і «Надзея» пад пагрозай ліквідацыі

Вярхоўны суд прызначыў дату разгляду пазову Мін'юсту пра ліквідацыю Беларускай экалягічнай партыі (БЭЗ). Слуханьне пачнецца 29 жніўня. Партыі закідаюць замалы колькасны склад, адсутнасьць рэгіянальных і гарадзкіх структураў, што супярэчыць заканадаўству. Падобныя праблемы паўсталі і перад Беларускай жаночай партыяй «Надзея».

## 10 жніўня

### Севярынцу не далі дазволу

Моладзевага лідэра **Паўла Севярынца** не выпускаюць за межы Беларусі. У аддзеле па грамадзянстве і міграцыі Першамайскага раёну Віцебску паліткы адмовіліся ставіць штамп, які дазваляе выезд з краіны.

### Арышт за сьцяг

Раніцай супрацоўнікі міліцыі і службы аховы затрымалі **Ільлю Шылу**, **Андруся Тычыну** і **Барыса Пархамчука**. Прычынаю стаўся бел-чырвона-белы сьцяг, што юнакі трымалі ў руках, вяртаючыся зь летніка. Міліцыянты ўжылі ў дачыненьні да непаўналетніх Тычыны і Шылы фізычную сілу. Праз некалькі гадзінаў затрыманых вызвалілі без складаньня пратаколаў.

## 13 жніўня

### Шчукіну параілі

Супрацоўнікі чыгуначнага РУУС Віцебску затрымалі праваабаронцу **Валерыя Шчукіна**, калі ён зьбіраў ахвяраваньні грамадзянаў на выплату маральнай шкоды **Тацяне Буевіч**, якая падчас выбарчай кампаніі ў мясцовыя саветы выконвала абавязкі сакратаркі пры старшыні абласной камісіі. За абразу Т.Буевіч і яшчэ трох чальцоў акруговай камісіі Шчукіну прысудзілі сплаціць валанцёрцы выбарчай камісіі 250 тыс. рублёў. Пэнсіянэр Шчукін вырашыў пайсьці зьбіраць грошы на вуліцу са зваротам да грамадзянаў аб аказаньні «65-гадоваму пэнсіянэру Валерыю Шчукіну фінансавай дапамогі дзеля выплаты 37-гадовай Тацяне Буевіч сродкаў на маральныя траты». Міліцыянты не знайшлі ва ўлётцы крамолы і праз дзьве гадзіны вызвалілі апазыцыянэра. Пры гэтым паппрасілі не распаўсюджваць зварот ды параілі папросту жабраваць.

### Клецкая пракуратура

аднавіла крымінальную справу супраць мясцовага актывіста і выдаўца незалежнага бюлетэню Сяргея Панамарова. Яе ўжо адзін раз заводзілі, але пасьля спынілі. Прычынай была нататка ў газэце «Бойкі Клецк», якую сп. Панамароў выдае ўласнымі сродкамі. Кіраўнічка Клецкай юрыдычнай кансультацыі Натальля Семашкевіч палічыла абразьлівай інфармацыю ў адным з артыкулаў.

**СП**


БАРЫС ГАРЭЦКІ
**У пікніку руху «За Свабоду» ўдзельнічалі каля трохсот чалавек.**

## IN MEMORIAM



# Галіна Войцік

У Вільні, на 81-м годзе жыцьця, памерла беларуская дзяячка Галіна Войцік. Яна была дачкой Антона Войціка і Зоські Верас. Выкладала нямецкую мову ў Віленскім пэдінстытуце, працавала на беларускай катэдры пэдунівэрсытэту. Г.Войцік стварыла нізку «Партрэтаў віленчукоў» пра знакамітых беларускіх дзеячоў, у тым ліку і пра свайго мужа Лявона Луцкевіча, якога яна перажыла роўна на 10 гадоў.

**pgrigas**

# Давайце рабіць выгляд

Рэфлексіі **Віталя Тараса** на тэму, узьнятую **Янкам Запруднікам** у артыкуле «Ўдзячнасьць — мастацтва душы» («НН «№29).

Янка Запруднік закрануў, па-мойму, вельмі актуальную й значную тэму. За што аўтару шчыры дзякуй!

Хацеў бы, скарыстаўшыся нагодай, крыху гэтую тэму разьвіць.

Польская тэлевізія «Паленія» паказвае цыкль перадачаў «Дзякуй за Салідарнасьць». У гэтых перадачах палякі выказваюць падзяку тым, хто дапамагаў іх краіне ў гады камуністычных рэпрэсіяў супраць прафсаюзу «Салідарнасьць» і яго прыхільнікаў у 1980-я. Дапамагалі тады ня толькі ўрадавыя ды няўрадавыя арганізацыі Захаду, бескарысьліва дапамагалі сваімі грашыма грамадзяне розных краінаў, людзі розных нацыянальнасьцяў. Дапамога ішла ня столькі на падтрымку апазыцыі, колькі канкрэтным сем'ям палякаў, што апынуліся ў турмах ці былі пазбаўленыя праз свае погляды магчымасьці зарабляць на хлеб. Больш як чвэрць стагодзьдзя мінула з таго часу, а ўдзячнасьць за салідарнасьць у сэрцах многіх палякаў жыве.

За апошнія пятнаццаць гадоў палякі нямала зрабілі для беларускай апазыцыі і для ахвяраў рэпрэсіяў. Дастаткова ўспомніць хаця б праграму Каліноўскага. Ды, зразумела, не адны толькі палякі зрабілі шмат добрага беларусам за апошні час — і амэрыканцы, і немцы, і чэхі, і латышы, і літоўцы. І ўсю замежную дапамогу пераважная большасьць беларускіх апазыцыянэраў успрымаюць як НАЛЕЖНАЕ.

Знаходзяцца й такія, што папракаюць замежнікаў за тое, што яны МАЛА дапамагаюць ва ўсталяваньні дэмакратыі ў Беларусі.

Наўрад ці падобнае стаўленьне можна патлумачыць толькі комплексам беднасьці (пра які піша Янка Запруднік). Даволі многія апазыцыйныя дзеячы займелі добрыя кватэры, машыны, магчымасьць езьдзіць за мяжу, аплочваць адукацыю сваіх дзяцей у замежных навучальных установах.

Зразумела, людзі паўсюль ёсьць людзі. І на Захадзе, нават у дабрачынных установах, ёсьць такія, хто кіруецца выключна карысьлівымі памкненьнямі. Беларусаў можа раздражняць пыха некаторых замежнікаў пры кантактах зь імі, іх манера размаўляць нібы паглядаючы на суразмоўцу зьверху.

Трапляюцца й звычайныя авантурысты, прайдзісьветы, якія, даючы нешта «на падтрымку дэмакратыі й культуры» , адразу даюць зразумець, што разьлічваюць на «адкат».

Многім маім калегам, думаю, не аднойчы даводзілася сустракацца з праявамі, так бы мовіць, марсіянства з боку замежных гасьцей. Гэта калі, нічога ня ведаючы пра рэальныя ўмовы жыцьця ў Беларусі, пра яе гісторыю і культуру, а таксама актуаліі сёньняшняга дня, госьці пачынаюць адразу павучаць беларусаў, як ім трэба жыць, якім чынам будаваць дэмакратыю, дзе браць грошы і на што іх выдаткоўваць.

> Не прадавайся — і ніхто цябе ня купіць.

Але гэта нічога не мяняе. Прынамсі — ніякім чынам не апраўдвае нас, беларусаў, за няўменьне і яшчэ часьцей нежаданьне дзякаваць. У народзе падобны стыль паводзінаў называюць ня вельмі літаратурна, але трапна: «Ні нас…, ні дзякуй».

Выглядае на тое, што беларусы апошнім часам актыўна пераймаюць досьвед свайго «старэйшага брата» ў дачыненьнях з замежнікамі.

Колькі мільёнаў тон гуманітарнай дапамогі атрымалі расейцы ад Захаду ў 90-я гады, колькі мільярдаў крэдытаў ад самых розных установаў і арганізацыяў, колькі зь іх было незваротна сьпісана… А ў адказ? Не цішыня, не! Крык і стогн стаіць: як Захад прынізіў Расею, як ён хацеў паставіць яе на калені! І гэты пры тым, што самы лепшы амэрыканец (піндос, як цяпер любяць казаць у Расеі) ня варты мезенца самага апошняга расейскага чалавека!

Такі стандарт грамадзкіх (калі так іх можна назваць) паводзінаў прымушае згадаць і іншы, але вельмі падобны чын дзеяньняў. Апынуўшыся на Захадзе, скарыстаўшыся палітычным прытулкам і атрымаўшы сацыяльную падтрымку цывілізаванай дзяржавы, палітычны эмігрант нярэдка на другі дзень пачынае выкрываць «жахі капіталізму» ў бяздушнай дзяржаве, якая яго прытуліла. Якая яна, маўляў, недасканалая, гэтая заходняя дэмакратыя, як не адпавядае высокаму ладу славянскае душы. Пасьлядоўнікаў такой крытыкі пасьля ўсім вядомага «вэрмонцкага адсельніка», на жаль, хапае ня толькі сярод расейскіх эмігрантаў.

Гэта вяртае нас да тэмы, закранутай на самым пачатку. Калі ты атрымліваеш нешта ад чалавека (ці дзяржавы, ці ўстановы), загадзя падазраючы, што акт падтрымкі ёсьць крывадушным, замаскаваным пад дабрачыннасьць актам падману альбо подкупу — дык ці варта прымаць такі дарунак? А калі ты яго прымаеш, дык якая тады розьніца паміж табой, любімым, і тым «нягоднікам», які хоча цябе падмануць? Не прадавайся — і ніхто цябе ня купіць. Попыт заўсёды нараджае прапанову.

Ёсьць і яшчэ адзін немалаважны аспэкт праблемы, узьнятай Янкам Запруднікам. Часам кажуць — усе гэтыя дзякаваньні, усьмешкі ў крамах і на вуліцах на Захадзе ёсьць усяго толькі звычайнай ветлівасьцю. За якой стаяць, нібыта, фальш і няшчырасьць. Калі нават у некаторых выпадках яно так і ёсьць, дык няма нічога кепскага ў тым, каб лішні раз сказаць дзякуй, хай сабе мэханічна. Што кепскага ў тым, калі мы зь дзяцінства прызвычаіліся есьці відэльцам і выціраць рот сурвэткай?

Давайце мы ўсе зробім выгляд, што мы выхаваныя, што мы ўжо жывём у Эўропе, што мы любім і паважаем саміх сябе, а значыць, і нашых блізкіх. І тады мы ўбачым, як хутка зьменіцца нашае жыцьцё да лепшага. А гаварыць «дзякуй» лёгка і прыемна.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ




Жніво на Добрушчыне.

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Сухарэнка, не тармазі — у апазыцыю ідзі!

Фэльетон Лёліка Ушкіна.

Ці ня час пачынаць ужо цяпер выбар будучага адзінага кандыдата ад Дэмакратычных сілаў? Мяркую, ім мог бы стаць Сьцяпан Сухарэнка. Па-першае, быць палітычным трансвэстытам пасьля асабістай адстаўкі — бонтон сярод нашых вэртыкальшчыкаў. Па-другое, Сьцяпан на фоне дэмакратаў проста па-за канкурэнцыяй.

Уявіце сабе наступны кангрэс дэмсілаў, на якім абіраюць новага Мілінкевіча.

Да мікрафона настойліва прэцца Лябедзька: прашу абраць мяне адзіным.

Голас з аўдыторыі: «А што ты зрабіў для рэалізацыі запаветаў Яські з-пад Вільні, Іваноўскага, Сапегі, Гілевіча, Дуніна, Ластоўскага?»

Лябедзька: Ну ты чё — абдаўбаўся, чувак! Я наведаў 345 сэмінараў, сустрэўся з 342 замежнымі дыпляматамі, агульная колькасць нэгатыўных словаў, сказаных пра рэжым у розных выданьнях, складае 234 070 лексічных знакаў!»

«Рэспэкт», — думае тусоўка.

Аднак тут на трыбуне намалёўваецца Сьцяпан і прапануе забойныя аргумэнты за сваю сьціплую асобу.

Дзякуючы дзейнасьці Сьцяпана на пасту кіраўніка канторы, КДБ канчаткова пазбавілася іміджу нейкай саліднай арганізацыі. Слова «КДБ» за кошт буйнай фантазіі СС стала падсьвядома выклікаць нейкую асацыяцыю з прыкольнымі байкамі пра дохлых пацукоў, замініраванымі грузінамі сярэдніх школах, афіцэраў, якіх вэрбуюць за пяць фугасаў «Крышталю». Адным словам, КДБ і сьмех цяпер ужо непадзельныя.

Каго абярэ Кангрэс? Натуральна, грамада падтрымае сп.Сухарэнку, які зрабіў канкрэтную інвэстыцыю ў справу трыюмфу грамадзянскай супольнасці — пахаваў аўтарытэт аднаго з інстытутаў таталітарнай дзяржавы.

**Фанатычны прыхільнік дэмакратыі,**
**Лёлік Ушкін**

# Месяц Беларусі

Фэстываль аўтарскага чытаньня ў Брно ўразіў беларускіх аўтараў іх чэскімі чытачамі. Піша **Наталка Бабіна**.



**Ева Вежнавец.**



**Лявон Вольскі.**



**Ян Максімюк.**

У ліпені ў чэскім горадзе Брно праходзіў фэстываль аўтарскага чытаньня, ганаровым госьцем якога сёлета была Беларусь. Гэта самы вялікі літаратурны фэстываль у Чэхіі. На працягу месяца кожны вечар у памяшканьні аднаго з самых папулярных у Брно тэатраў «Гуса на провазку» («Гусь на канаце») выступалі чэскія і беларускія аўтары з чытаньнем сваіх твораў. На працягу месяца над тэатрам лунаў беларускі нацыянальны сьцяг.

Фэстываль існуе ўжо восем гадоў. Мінулы год у якасьці ганаровага госьця арганізатары запрасілі пісьменьнікаў з Бэрліну. Дык вось пасьля выступу гледачы гаварылі мне — а мне пашчасьціла прыняць удзел у фэстывалі, — што беларускія літаратары сёлета сваімі творамі зрабілі большае ўражаньне, чым нямецкія летась.

А на мяне — як, думаю, і на астатніх беларускіх удзельнікаў — найбольшае ўражаньне зрабілі гледачы — яны ж чытачы. Штовечар на працягу месяца на выступы беларускіх аўтараў у Брно зьбіралася па 20—70 чалавек. Ці была б такой самай «яўка» беларускіх чытачоў у Менску, які больш за Брно разы ў чатыры, на выступы чэскіх аўтараў? А колькі людзей прыходзіла б на выступы беларускіх аўтараў у сталіцы Беларусі? У Брно штовечар паслухаць «туземскіх» літаратараў прыходзіла чалавек пад 200…

Сымпатычныя маладыя пары, дзяўчаты студэнцкага выгляду, вядомая журналістка, вядомы тэатральны дзяяч, грамадзкі актывіст — прыхільнік аўтаноміі Маравіі, людзі задуменна-філязофскага выгляду сярэдняга веку — такой была аўдыторыя падчас майго выступу. А як выдатна яны слухалі! Час ад часу паглядаючы ў залю, я проста радавалася: вочы, прыкаваныя да экрану, на якім сынхронна з чытаньнем ішоў пераклад на чэскую, цішыня — муха не праляціць незаўважна; было відаць, што людзям сапраўды цікавы гэты тэкст, што іх захапляе гісторыя, якая расказваецца…

Мяркуючы па сардэчнай абстаноўцы, па цікавых пытаньнях, па тым, як пасьля выступу гледачы падыходзілі



**Андрэй Хадановіч.**

за аўтографамі і проста дзеля таго, каб падзякаваць, — тое, што яны шукалі, яны ўсё ж такі знайшлі.

Мая сяброўка Марыя Вайцяшонак неяк прыпячатала: «Калі ў цябе ёсьць хаця б адзін чытач — ты пісьменьнік». Цікавыя і зацікаўленыя, добразычлівыя чэскія чытачы дапамаглі адчуць сябе пісьменьнікамі трыццаці беларускім літаратарам — каму, можа, у тысячны, а каму і ў першы раз…

Хацелася б падзякаваць арганізатарам гэтага фэстывалю — агенцтву і выдавецтву «Ветрнэ млыны» ў асобах Петра Мінаржыка, Паўла Ржэгаржыка і Любаміра Сувы і, канечне, Сяргею Сматрычэнку, на якога лёг цяжар арганізацыі беларускай часткі фэстывалю. Цяжар немалы: за фэстывальны месяц

**Месяц аўтарскага чытаньня**

1—31 ліпеня ў горадзе Брно прайшоў «Месяц аўтарскага чытаньня», найбуйнейшы літаратурны фэст у Чэхіі. Штодня на сцэне славутага тэатру «Husa na provázku» праходзіла сустрэча з адным беларускім госьцем і адным чэскім. За месяц сваю творчасьць прадставілі 30 беларускіх пісьменьнікаў. Сярод іх былі Уладзімер Арлоў, Алесь Разанаў, Уладзімер Някляеў, Наталка Бабіна, Пятро Васючэнка, Барыс Пятровіч, Андрэй Хадановіч, Альгерд Бахарэвіч. Бралі ўдзел аўтары зь Беласточчыны Надзея Артымовіч, Міра Лукша, праскія беларусы Макс Шчур, Аляксандар Лукашук, Ян Максімюк. Сьпявалі Лявон Вольскі ды Віктар Шалкевіч. Вечарыны трансьляваліся ў рэжыме он-лайн. Фэст стаў першай аж такой буйной прэзэнтацыяй сучаснай беларускай літаратуры ў Эўропе.


Вольга Гапеева.

спадар Сяргей, падалося, нават заўважна схуднеў. Тым ня менш, яго праца была на вышыні: ён — асноўнае — разам зь іншымі якасна пераклаў на чэскую вялікія кавалкі з твораў, ён сустракаў, разьмяшчаў у акуратнай і стылёвай двухпавярховай кватэры (якая сама па сабе магла служыць крыніцай натхненьня дзякуючы сваёй аўры — беленыя зводы, цёмныя драўляныя бэлькі, вінтавыя сходы, сухацьветы і плеценыя старасьвецкія скрыні са скуранымі боцікамі), суправаджаў і праваджаў беларускіх гасьцей…

Ня ведаю, ці задаволеныя арганізатары фэстывалю яго вынікамі. Але, пэўная, для беллітаратуры нейкі плён ён дасьць. Бо, канечне, хаця ніякі фэстываль не дапаможа пісаць лепш, чым ты пішаш, але нейкае новае ўражаньне — ад польскіх дзетак, якія машуць цягніку, да зламаных дамскіх абцасікаў, якімі поўняцца шчалюбіны брукоўкі на Карлавым мосьце, — пэўна, прарасьце нечаканымі і невядомымі кветкамі ў новых тэкстах.

І, у любым выпадку, матэрыялы фэстывалю будуць на працягу году даступныя ў інтэрнэце па адрасе www.autorskecteni.cz.

**Фота Пэтра Копржывы.**


Уладзімер Арлоў і Сяргей Сматрычэнка.


Уладзімер Някляеў.


Наталка Бабіна.



# Помнік Магдэбурскаму праву ў Берасьці

Зусім нечакана, але прыемна. На скрыжаваньні вуліц Савецкая і Маякоўскага ўсталяваны вялікі бронзавы памятны знак у гонар атрыманьня ў 1390 г. Берасьцем першым сярод беларускіх гарадоў магдэбурскага права на самакіраваньне. На табліцы месьціцца вытрымка з прывілею: «Даруем на вечнасьць права гарадзкое магдэбурскае, адхіляючы іншыя правы польскія, літоўскія і рускія, і ўсе іншыя звычаі, якія былі б не ўзгоднены з правам гарадзкім магдэбурскім». А па краях знака выграviраваныя даты атрыманьня беларускімі гарадамі магдэбургскага права. Першым стаіць 1390 — год наданьня яго Берасьцю.

**Павал Белавус**

## СЬЦІСЛА

### Беларускія кнігі атрымалі ў Маскве 10 дыплёмаў

На IV Міжнародным конкурсе «Мастацтва кнігі» 9—10 жніўня ў Маскве, дыплёмы І ступені атрымалі энцыкляпэдыя «Беларускі фальклор», альбом «Почтовые марки Республики Беларусь», зборнік вершаў «Мама. Маці. Матуля» выдавецтва «Мастацкая літаратура».

**Паводле блогу Бібліятэкары Беларусі.**

### У Карлавым унівэрсытэце будзе выкладацца беларуская мова

З такой ініцыятывай выступілі самі студэнты знакамітага чэскага ўнівэрсытэту. Ад новага акадэмічнага году будзе ўведзены двухсэмэстравы курс для пачаткоўцаў пад кіраўніцтвам доктара Юрася Бушлякова.

**Мілан Мінаржык**


PHOTO.BYMEDIA.NET

Як скупнуцца ў фантане і не намачыць галаву? Менская моладзь ведае адказ.

### Ён здымаў грошы з вашых картак

33-гадовы мянчук падрабіў плястыкавыя карткі й зь іх дапамогай атрымаў з банкаматаў амаль 120 млн рублёў. Мужчына працаваў эканамістам у адным з буйных банкаў Беларусі й быў спэцыялістам па абслугоўваньні банкаматаў. Больш за тры гады — ад 2004 да 2007-га ён здымаў з дапамогай фальшывых банкаўскіх картак грошы. 100 млн рублёў з гэтых грошай ён вярнуў пасьля затрыманьня.

### На Беларусь абрынуўся зорны дождж

Жыхары Паўночнага паўшар’я ў аўторак і сераду маглі назіраць мэтэорны паток г.зв. Пэрсэідаў, паколькі візуальна падаецца, што яны лятуць з сузор’я Пэрсэя. Але на самай справе гэта мікрачасьцінкі, што ўтварыліся ў выніку распаду камэты Суіфта—Тутля. За год Зямля перасякае дзясяткі такіх патокаў, але толькі ў жніўні, калі неба чыстае, можна атрымаць асалоду ад гэтага відовішча.

### Згасілі Вечны агонь

Вінаватымі ў здарэньні сталі тры п’яныя жыхары вёскі Цнянка Менскага раёну. Прыкладна а палове на пятую раніцы яны полымя загасілі. Адзін з хуліганаў — 20-гадовы працоўны прадпрыемства «Гарызонт», а другі — 21-гадовы маладзён, што раней быў судзімы за хуліганства.

### Бэбі-бумэры 80-х уваходзяць у шлюбны ўзрост

Вялікая колькасьць моладзі да 30 гадоў стала прычынай росту нараджальнасьці. За студзень—май у Беларусі зьявілася 41,3 тыс. немаўлят, што на 9,1% больш, чым летась.

### Калі мэтро пойдзе ва Ўручча

КУП «Мінсктранс» распрацавала праект руху наземнага грамадзкага транспарту ў мікрараёне Ўручча пасьля працягу першай лініі мэтро. Праект апублікаваны на афіцыйным сайце прадпрыемства.

### Зьмены ў правілах паляваньня

У Беларусі пачаўся чарговы сэзон летне-асеньняга паляваньня на вадаплаўную і балотную птушку. Згодна з прынятымі зьменамі ў правілах паляваньня, тэрміны паляваньня на вадаплаўную птушку падоўжаны да другой нядзелі сьнежня. Павялічылася і колькасьць дзён у тыдні, калі дазволена паляваць: цяпер можна ў суботу, нядзелю, панядзелак і аўторак.

### Наш плэйбой у Канадзе

18-гадовы гомельскі хакеіст Міхаіл Сьцефановіч едзе гуляць у Канаду. За хакеістам «Гомелю» нядаўна спэцыяльна прылятаў легендарны брамнік Патрык Руа, уладальнік чатырох Кубкаў Стэнлі. У верасьні Сьцефановіч разам з бацькам Ігарам, у мінулым таксама хакеістам, адправіцца працаваць у Квэбэк, у тамтэйшай юнацкай камандзе. Двухмэтровы бляндын Сьцефановіч стаў адным з самых заўважных хакеістаў краіны.

### Арыштаваны за саматужны пераклад кнігі пра Потэра

У Францыі арыштаваны падлетак, якога падазраюць у публікацыі ў сеціве ўласнага поўнага перакладу апошняй кнігі пра Гары Потэра. Яму могуць выставіць абвінавачаньні ў парушэньні аўтарскіх правоў. Сайт, на якім знаходзіўся тэкст, быў закрыты паліцыяй. Вядзецца сьледзтва. Сёмая, заключная частка сагі пра Гары Потэра, стала самай хуткапрадавальнай кнігай у гісторыі — за першыя 24 гадзіны было прадададзена 11 млн ангельскамоўных копій.

### Энэргія зь цела чалавека

Нямецкія навукоўцы распрацоўваюць тэхналёгію, што дазваляе здабываць энэргію зь цяпла чалавечага цела. Дзякуючы гэтаму адкрыцьцю можна будзе, напрыклад, зараджаць батарэю мабільнага тэлефона, проста трымаючы яе ў руцэ.

**Паводле BBC Russian, Звязда, БЕЛТА, dziennik.pl**

## Марозіва за мову

**Адзін хлопец ва ўнівэрсаме «Нарач» так расчуліўся**, што мая 5-гадовая дачка гаворыць чыста па-беларуску, што купіў ёй марозіва. Такія вось казкі жыцьця...

**Жанна, Менск**

## Дзе б ні ехала, дзе б я ні ішла...

**Прачытала эсэ Я.Запрудніка пра ўдзячнасьць** (№29), і ў галаву прыйшла старая народная песьня: «Дзе б я ні ехала, дзе б я ні ішла...» Дзякавала гераіня і сваім, і чужым, нават парогу, што выраджаў яе ў дарогу. Я да таго, што ўдзячнасьць была ўласьцівая беларусам. Гэта як пасавецілі нас, то і нелюдзямі парабіліся мы.

Калісьці была я на сустрэчы з Рыгорам Барадуліным. Дык ён дзякаваў-дзякаваў за найменшае добрае слова. Проста зь языка ў яго той «дзякуй» не сыходзіў. Старога выхаваньня чалавек.

Слова добрага ня скажа – так у нас казалі на зьлдня...

**Ганна Яўневічыха, Ліда**

## Кантрасты заходнебеларускай вёскі

**У вёсцы Парфенава на Докшыччыне 5 жніўня адбыліся сьвятарскія пасьвячэньні** — два дыяканы атрымалі сакрамант сьвятарства і сталі ксяндзамі. На ўрачыстасьці былі біскуп Уладзіслаў Блін ды апостальскі нунцый Марцін Відавіч. Вернікі цягам апошніх дзён рыхтаваліся да ўрачыстасьці: упрыгожвалі касьцёл знутры і звонку, дзеці надзімалі паветраныя шарыкі і вывешвалі па-над сцэнай на двары, дзе будзе адбывацца канцэрт мясцовых школьнікаў ды папулярнага сярод каталіцкай моладзі полацкага гурту «Кадаш»: трэба ж, каб пасьля не было сорамна за выгляд свайго касьцёлу.

А за мэтраў пяцьдзясят ад касьцёлу стаіць вясковая прадуктовая крама. Каля яе на лаўцы — купка людзей, якіх урачыстасьць не цікавіць. Дый ці ведаюць яны, што мае адбыцца? Некаторых я добра ведаю. Падыходжу. Адзін пытаецца: «Як жыцьцё?» — «Нармальна». — «Ці паступіў?» — «Так, ва ўнівэрсытэт». — «Колькі год вучыцца?» — «Пяць». — «Дык гэта ж п..ец, колькі часу мазгі я..ць!» Больш размаўляць няма аб чым.

Да крамы падыходзіць адна мясцовая жанчына. Адзін жыхар голасна вітае яе словамі, якія выразна паказваюць адносіны гэтых людзей да слабой паловы чалавецтва: «Здароў, Маруся! Стань ракам — я ўпруся!» Тая буркнула: «Лепей я з сабакам павітаюся, чым з вамі», — ды нахілілася да сабакі, што падбег да яе ног. Уся кампанія засьмяялася ды працягвала аб нечым гаманіць, шчодра сыплючы адборным матам…

З сумам падумалася: усе людзі — і тыя, што шчыравалі ў касьцёле, і тыя, што сядзелі ля крамы, — нарадзіліся ў адной і той вёсцы, хадзілі ў адну і тую школу, працавалі на той жа зямлі. А вось жа якая розьніца. Нехта думае пра тое, што трэба маліцца Богу, а ў некага ў галаве, дзе ўзяць грошы на выпіўку.

**Кастусь Шыталь, Крулеўшчына (Докшыцкі раён)**

## Фэст быў проста супэр

**У Браславе прайшоў штогадовы фэст традыцыйнае культуры — Сьвята рамёстваў.** Сьвята пачалося са здабычы жывога агню. Пасьля паказалі рамёствы, адноўленыя па археалягічных матэрыялах, а гэтаксама й традыцыйныя народныя рамёствы.

Тады ансамбль «Вярба» зь вёскі Дрывяты выканаў абрад «Дажынкі» і, як слушна зазначыла вядоўца фэсту, — «Нашы «Дажынкі» ня горшыя за прэзыдэнцкія!»

Хто цікавіўся мастацтвам, мог паглядзець выставу твораў мастака Міколы Стаса, а каму карцела трапіць у пракаветныя часіны — мог завітаць у будынак музэю. Тамака разьмяшчалася экспазыцыя «Жывая археалёгія».

На сьвяце праводзіўся паватовы конкурс саломапляценьня «Жыцень», і, вядома, сьвята не магло абысьціся без старажытнае кухні: кожны мог пакаштаваць смачных бліноў зь мёдам ды кашы са скваркамі.

Добрай традыцыяй стала выступленьне гурту «Стары Ольса». Фэст выйшаў проста супэр! Спадзяюся, на наступны год сьвята зьбярэ яшчэ больш гасьцёў.

**Гальляш Сялява, Браслаў**

## Шлях да ідэальнай сыстэмы

**Улада імкнецца стварыць ідэальную сыстэму — сыстэму са 100-працэнтовай падтрымкай насельніцтва.** Шляхі дасягненьня гэтай ідэі самыя розныя.

Умоўна, такой ідэальнай сыстэмай можна назваць войска. Тут існуе свой ідэалягічны курс, які мусяць падтрымліваць усе жаўнеры, прыняўшыя прысягу. Эфэктыўна працуе сыстэма вэртыкалі, якая вызначаецца колькасьцю і якасьцю зорак на пагонах. А ўсё гэта трымаецца з дапамогай загадаў, якія нельга парушыць. Якім бы глупствам ты ні лічыў загад, яго ўсё роўна даводзіцца выконваць. Потым можна аспрэчыць, але звычайна да гэтага ўжо няма нікому справы.

Вайскоўцы ідэальна выконваюць грамадзянскія абавязкі, асабліва — удзел у выбарах. Галасуе самым першым, сама «лепей» і з удзелам абсалютна ўсіх жаўнераў.

Прыгадваецца выпадак, калі адзін жаўнер адмовіўся галасаваць на выбарах у мясцовыя саветы, што матываваў павышаным ціскам на апазыцыю і масавымі фальсыфікацыямі. Гэта прыняло ідэолягаў брыгады ў шокавы стан. На працягу трох гадзін няспынна прыходзілі ледзь ня самыя высокія чыны брыгады і па-дзіцячы ўгаворвалі, пераконвалі, прасілі юнака пайсьці прагаласаваць. Калі не дапамагло, паставілі задачу звычайным жаўнерам-бээрэсэмаўцам пераканаць яго ў тым, што ён падводзіць калектыў. А яго непасрэднага начальніка, увогуле, ледзь ня вырвалі з адпачынку за некалькі сотняў кілямэтраў. Урэшце жаўнеру загадалі, і ён выканаў загад. Канечне, яго можна было аспрэчыць, але справа ўжо ня ў гэтым, а ў тым, што парушылася, здаецца, непарушная сыстэма, чаго раней не было.

Хутка зноў выбары. І погляды дэмакратычных лідэраў зноў падзяліліся: адны імкнуцца ўдзельнічаць у іх, іншыя байкатаваць. Якая пазыцыя будзе мець рацыю — складанае пытаньне. Але, кажучы словамі Казуліна, наша сыстэма як хісткая цагляная сьцяна. Дастаткова выбіць адну цаглiну, як сьцяна рухне. Чым ідэальнейшай выглядае сыстэма, тым прасьцей зруйнаваць яе, галоўнае знайсьці тую цагліну...

**Юры Бакур, Берасьце**

## Вясёлы летнік пад Воўчынам

**З 3 да 5 жніўня не зарэгістраваны яшчэ рух «За Свабоду» разам з моладзевай арганізацыяй «Дзедзіч» правёў традыцыйны моладзевы летнік каля мястэчка Воўчын**, што ў Камянецкім раёне. У летнік прыехалі вясёлыя людзі зь Берасьця, Баранавіч, Каменца.

Гралі ў валейбол і дартс, у якіх бясспрэчным пераможцам стаў Зьміцер Палойка.

Вечары над возерам былі насычаныя забавамі й дэбатамі. Начны канцэрт маладога барда Аляксандра Дземенчука з Каменца зьяднаў усіх.

4 жніўня ўдзельнікі летніка наведалі мястэчка Воўчын, вядомае руінамі касьцёлу, а таксама як месца пахаваньня апошняга караля Рэчы Паспалітай.

Галоўнай падзеяй летніка стала шоў-праграма «Сапраўдны Беларус», падрыхтаваная Паўлам Белавусам. Яна складалася з васьмі конкурсаў на спрытнасьць, лідэрскія якасьці, красамоўе, вакальныя здольнасьці, веданьне фальклёру. У апошнім конкурсе фіналістам за 30 хвілін трэ было напісаць вершык пра летнік. У вершыку трэ было ўжыць прапанаваныя гледачамі словы.

І вось што выйшла:

Сашко Яўген:

Тут рамантыка паўсюль:
Лес, намёты, Віка вунь,
Шышкі, вожыкі, тушонка,
Тут ты знойдзеш сабе жонку.
Тут сьпявае бард Алесь —
Так, што замірае лес,
А таварыш Лукашэнка
Ўвесь нэрвуецца страшэнна.
Ведай, дзядзька, колькі б жыў —
Ты бы так не адпачыў.

Клімус Віктар:

Рамантыка жыцьця, змаганьня,
Кола намётаў у хвайніку.
Сустрэнеш новае сьвітаньне,
Тулі́ўшы да рукі руку.
Ня гора — брыдкая тушонка,
І Лукашэнка не замін,
Ў душы застанецца старонка,
Той незабыўны ўспамін.
Пра вожыкаў у начы вар'яцкіх,
Пра нашу веру, імпэт і гарт…
Каб болей здольнасьцяў мастацкіх —
Запеў бы, ды, на жаль, ня бард.

У выніку галасаваньня пераможцам стаў Віктар Клімус. Падарункам пераможцу стала спэцыяльна падрыхтаваная актывістам руху Дзянісам Турчаняком копія пляну Берасьця XVII ст.

**Адзін зь «Дзедзіча»**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Аджара

Курорт, які эўрапеізуецца ў вас на вачах. Піша **Сяргей Харэўскі.**



**Бераг турэцкі. Мяжа Грузіі за 14 км ад Батумі. Праезд вольны.**

Аджарыя, ці Аджара, як называюць той край самі яе жыхары — выключэньне з правілаў. То бок выключэньне з нашых уяўленьняў пра Каўказ. Адгароджаная з трох бакоў высачэзнымі гарамі Малога Каўказу, а з чацьвертага боку — морам, Аджара — самае цёплае месца ў гэтых шыротах у сьвеце. Нават зімою паветра тут блізу + 10. А ўлетку блізу + 30. Тэмпэратура й атмасфэрны ціск мала вагаецца нават уначы. Неабсяжныя цытрусавыя сады й эўкаліптавыя прысады гэтак насычаюць паветра, што дыхаецца тут, як у вялікім інгалятары. Ёсьць тут і ўнікальныя пляжы Супсы, з магнэтытавым пяском… За савецкіх часоў сюды штолета прыяжджала пад мільён (!) людзей…

## Субтропікі і сьнежныя вяршыні

Але гэтым разам я дазнаўся, што ў тутэйшых горных раёнах, што складаюць дзьве траціны тэрыторыі Аджары, сьнег ляжыць ажно сем месяцаў! А старыя эўкаліптавыя прысады былі закладзеныя тут, каб змагацца з букетам хваробаў, на якія пакутавалі жыхары прыбярэжных раёнаў, што былі суцэльнаю малярыйнаю багнаю яшчэ сто гадоў таму. І ўвесь гэты кліматычны цуд — створаны рукамі. І да сёньня раён мястэчка Чакві лічыцца адным з самых вільготных месцаў плянэты, дзе ў пачатку XX ст. адзін кітайскі навуковец упершыню ў тагачаснай Расейскай імпэрыі разьвёў новыя гатункі чаю, дзеля чаго былі прывезеныя работнікі з… Грэцыі. А тутэйшае некранутае балота Іспані ўнесенае ў сьпіс сусьветнае спадчыны.

Яго можна ўбачыць проста зь цягніка, калі ён паварочвае, нарэшце, у бок мора. У дрыготкай вільготнай смузе разьлягаецца непралазная багністая маса, што жыве сваім слотным жыцьцём, нібы акіян Салярысу.

Пасьля за вакном зьявіцца закінуты старажытны горад Петра, на высокай паўвысьпе над морам, ля мястэчка Цыхісдзыры. Некалі тут сыходзіліся шляхі з Каўказу ў Бізантыю.

Да нядаўняга часу ўваход сюды быў забаронены. Як і ў бальшыню іншых куткоў Аджары.

Пры канцы 1980-х мяне зь сябрамі разьвярнулі на выезьдзе з Батумі. Дзьве траціны аўтаномнай рэспублікі былі наглуха закрытыя ад сьвету — памежная зона. Міжволі згадалася тут, як у 1930 годзе адсюль імкнуўся прабрацца ў вольны сьвет Алесь Змагар, уцёкшы зь Менску.

Хелвачаурскі, Кедзкі, Хулойскі й Шуахеўскі раёны толькі цяпер адкрыліся для гасьцей.

«Тут расеец стаяў! Шлягбаўм быў. А ў мяне там бацькі пахаваныя», — з горыччу распавядае выпадковы спадарожнік. Нельга было сюды патрапіць без спэцдазволу нават з батумскай прапіскаю. Цяпер можна.

## Першыя госьці

Гасьціннасьць простых людзей у гэтых маналюдных і чыстых мясьцінах проста зачароўвае. У райцэнтры Кеда на 800 дамоў 80 крамаў… Запытаўся ў першага маладога чалавека ў форме мытніка, які быў нам спадарожнікам ад Батумі, дзе тут можна пад'есьці… «У мяне!» — адказаў ён. Праз паўгадзіны мы ўжо сядзелі за вялікім сталом, разглядалі сямейныя альбомы. Бацькоўская кватэра нашага знаёмца напаўнялася людзьмі. Такія госьці, як мы, тут яшчэ вялікае дзіва. «Аксана! Тут да нас твае землякі зь Беларусі прыехалі!» Аксана аказалася старой украінкаю з-пад Адэсы: «Як я буду гаварыць па-ўкраінску, вы ж усё зразумееце?» Прыйшла й старая расейская кабетка Лена зь ярка-блакітнымі вачыма. «Не шкадуеце,— спытаўся,— што сюды пераехалі?»

«60 гадоў не шкадавалі, а цяпер ужо што гаварыць…»

Старыя, Аксана зь Ленаю, шпарка гавораць па-грузінску, міжсобку ў тым ліку…

Палова людзей не гавора па-расейску наагул.

Агульны сьмех выклікала спроба перакласьці маё прозьвішча на грузінскую: «Харэ» — муж каровы! Бык!»

Горы зялёным мурам схіліліся над мястэчкам. Машынаў тут мала. Сіпяць пырскамі порсткія рэкі.

У райцэнтры Кеда ёсьць выдатны этнаграфічны музэй, вялікі прыдарожны крыж, помнік землякам, якія не вярнуліся з апошняе вайны, і мэмарыял забітым савецкімі амонаўцамі 9 красавіка 1989 году ў Тбілісі 16 юнакам-патрыётам.

## Мячэты не для чужых

А вось дзе ў Кедзе мячэт, урэшце, так і не паказалі… Маўляў, туды толькі старыя ходзяць. «Сяргей — расейскае імя. А ў мяне грузінскае — Ахмэт!» — кажа стары інжынэр-электрык на ГЭС у Махунцэці.

Ён таксама паўтарыў школьныя ісьціны, завучаныя за партаю, пра спрадвечную праваслаўную веру. Толькі пасьля, захапіўшыся, спадар Ахмэт распавёў, што ў ягоным родным горным сяле мячэт прыгожы, старажытны…

Аджары — пераважна мусульмане. Але не імкнуцца гэтага афішаваць. Стаўленьне да веры тут супярэчлівае. Тут, паводле хрысьціянскае традыцыі, у старажытным горадзе-крэпасьці пахаваны эвангеліст Матвей… Але й іслам у Аджару патрапіў раней, чым куды на Каўказ. Цяпер стаўленьне да ісламу ў Аджары нагадвае стаўленьне да грэка-каталіцызму ў Беларусі. З аднаго боку, з савецкіх часоў, у школьных падручніках роля ісламу ў гісторыі Грузіі трактуецца нэгатыўна й прадузята. Рыхтык як у нашых савецкіх падручніках роля Уніі. А зь іншага боку, іслам у VIII ст. вярнуў сюды антычную спадчыну, філязофію,

**Працяг на старонцы 28.**

# Вялікі дзякуй

**Алене Л., А.П., Н.Б., Г.Я., Вользе Я., Сяргею К., Аляксандру Л., Г.Б., Алене М., Тацяне Я., Алегу А., А.Л., Але Т., Аляксандру Ф., В.П., Д.К.. В.Г., Сяргею Ш., А.І., Аляксандру К.** зь Менску.

**А.К., Надзеі Дз.** зь Менскага раёну.

**Мікалаю Х.** са Шчучынскага раёну.

**Алесю Б., Алесю Г.** з Баранавічаў.

**Фёдару К.** з Талачынскага раёну.

**Д.Ш.** са Сьветлагорскага раёну.

**Аляксандру С.** з Мазырскага раёну.

**Алене К., Канстанціну К.** з Рэчыцкага раёну.

**Аляксандру М.** з Гомелю.

**Уладзімеру П.** з Аршанскага раёну.

**Г.К.** з Горадні.

**Раісе А., Любові Ш.** зь Віцебску.

**Зьмітру К.** з Мастоўскага раёну.

Заклікаем **чытачоў**, якія атрымліваюць газэту, але **яшчэ не прыслалі дамовы**, зрабіць гэта як найскарэй. З пытаньнямі пра дамовы, аплату і дастаўку зьвяртайцеся па тэл.: (017) 284–73–29, (029) 260–78–32, (029) 618–54–84.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

# Расстраляная археалёгія

У Курапатах стаіць вялікі дубовы крыж — знак памяці сучаснага пакаленьня археолягаў пра нявінна забітых калег, якія закладалі падмурак акадэмічнай археалёгіі. Аляксандра Каваленю, Аляксандра Ляўданскага і Сяргея Дубінскага расстралялі ў адзін дзень — 28 жніўня 1937 г. Піша **Мікола Крывальцэвіч**.

Уваходжаньне кожнага археоляга ў беларускую археалягічную навуку пачынаецца з трох тамоў «Прац» — навуковых выданьняў Інстытуту беларускай культуры, а пазьней Акадэміі навук 1928—30 г. Беларускія археолягі падрыхтавалі і чацьверты том «Прац», але зборнік не пабачыў сьвет, яго зьнішчылі ў наборы. Том складаўся з артыкулаў, сярод якіх цэнтральнае месца займалі працы Аляксандра Ляўданскага, Аляксандра Кавалені, Сяргея Дубінскага. Іх расстралялі ў Менску 28 жніўня 1937 г.

Загінуў ня толькі чацьверты том «Прац». Бясьследна зьнікла адна зь першых фундамэнтальных прац даваеннага пакаленьня археолягаў «Нарысы па гісторыі даклясавага грамадзтва на тэрыторыі Беларусі». Рукапіс яе неаднаразова абмяркоўваўся ў 1930-я ў Інстытуце гісторыі. Таксама зьнікла праца Сяргея Дубінскага, прысьвечаная сыстэматызацыі вядомых у 1930-я археалягічных помнікаў Магілёўшчыны.

## Час адкрыцьцяў

З 1926 да 1936 г. у БССР інтэнсіўна вяліся археалягічныя раскопкі і разьведкі помнікаў усіх эпох і пэрыядаў. Менавіта тады археоляг Канстанцін Палікарповіч і яго паплечнікі адкрылі самыя старажытныя паселішчы на тэрыторыі Беларусі — Бердыж і Юравічы. Менавіта тады Ляўданскі распрацаваў канцэпцыю ўзьнікненьня і разьвіцьця гарадзішчаў жалезнага веку, Каваленя адкрыў паселішчы раньніх славян на Палесьсі, а Дубінскі дасьледаваў вядомае цяпер ва ўсходнеэўрапейскай археалёгіі Банцараўскае гарадзішча. У 1933 г. выйшла кніга Сяргея Дубінскага «Бібліяграфія па археалёгіі Беларусі і сумежных краін», у якой былі сабраныя практычна ўсе вядомыя на той час назвы апублікаваных у сьвеце прац, прысьвечаных археалёгіі Беларусі. Менавіта тады пачалі распрацоўваць беларускую археалягічную тэрміналёгію.



**Аляксандар Каваленя**

нар. у 1895 у вёсцы Кашніцы Гарадзенскага павету. У 1915 ён скончыў Сьвіслацкую настаўніцкую сэмінарыю, у час першай усясьветнай вайны з бацькамі у бежанстве ў Курскай губэрні. Там мабілізаваны. У складзе Чырвонай Арміі ваяваў супраць Врангеля, бацькі Махно. Трапіў у палон да махноўцаў, быў прыгавораны да расстрэлу, але здолеў уцячы. Каваленю мучылі страшныя болі ў нагах — вынік халоднай і галоднай чырвонай ваеншчыны.

У 1923 паступіў на сацыяльна-гістарычны факультэт БДУ. З 1925 у складзе гістарычна-археалягічнай камісіі Інбелкульту, займаўся вывучэньнем старажытнага Менску. Удзельнічаў у раскопках курганоў ля Заслаўя, Бердыскай палеалітычнай стаянкі, Банцараўскага гарадзішча. У 1932 залічаны ў штат сэкцыі археалёгіі Інстытуту гісторыі.

Расстраляны ў 1937 па абвінавачаньні ў шпіянажы на карысьць Польшчы.

У беларусістыку ў 1920-я пацягнулася шмат моладзі, якая паверыла абяцаньням бальшавікоў. Ідэя нацыянальнага адраджэньня, здавалася, набывала рэальнае ўвасабленьне. Імкліва разьвіваўся краязнаўчы рух, моладзь прагнула адкрыцьцяў і вывучэньня свайго краю. Археалёгія складала «залаты» патэнцыял беларускага адраджэньня 1920-х. Мінулае прыцягвала, бо праз прызму старажытнасьці заўсёды можна ўбачыць нацыянальную пэрспэктыву, адчуць сябе нашчадкам сівых і легендарных эпох. Бацькаўшчына набывае сакральнае значэньне менавіта тады, калі ты зьведваеш тысячагадовасьць яе існаваньня.

## Дасьледчык першых стаянак чалавека

На хвалі студэнцкага краязнаўчага руху ў беларускую археалёгію прыйшоў Аляксандар Каваленя. На сацыяльна-гістарычны факультэт БДУ ён паступіў у 1923 г. Ужо ў 1925 г. яго ўключылі ў склад гістарычна-археалягічнай камісіі Інбелкульту, дзе ён займаўся вывучэньнем старажытнага Менску. Вынікам археалягічнага назіраньня за будаўнічымі працамі на Нямізе стала яго першае навуковае спавешчаньне. За гады вучобы ва ўнівэрсытэце ён пасьпеў папрацаваць у многіх экспэдыцыях, у тым ліку паўдзельнічаць у раскопках курганоў ля Заслаўя, Бердыскай палеалітычнай стаянкі, Банцараўскага гарадзішча. У 1927 г. сумесна зь Сяргеем Шутавым — студэнтам-мэдыкам БДУ — Каваленя зьдзяйсьняе адну з найбольш пасьпяховых сваіх археалягічных вандровак па Тураўшчыне.

Археалягічныя пошукі вяліся ім у складзе студэнцкага краязнаўчага таварыства. У 1930 г. у другім томе «Прац» выйшаў артыкул «Матэрыялы з дагісторыі Тураўшчыны» аўтарства Кавалені і Шутава.

Пра тыя студэнцкія «бадзяньні», напоўненыя маладым задорам і прыгодамі, успамінаў Мікола Ўлашчык. Яны сябравалі з Каваленем і часта выпраўляліся разам у рызыкоўныя археалягічныя і краязнаўчыя вандроўкі. Каваленя, са слоў Улашчыка, вылучаўся разважлівасьцю і практычнасьцю. І ня дзіва, да паступленьня ва ўнівэрсытэт ён прайшоў няпросты жыцьцёвы шлях поўны драматызму і рызыкі.

У 1932 г. А.Каваленю, як аднаго з найбольш пэрспэктыўных археолягаў, залічылі ў штат сэкцыі археалёгіі Інстытуту гісторыі. Яму ішоў 37 год. Да таго часу ён надрукаваў цікавыя навуковыя працы, меў вялікі вопыт



**Аляксандар Ляўдански**

нарадзіўся ў 1893 у вёсцы Юр'ева Смалявіцкага раёну на Меншчыне. Археалягічную адукацыю атрымаў у Смаленску.

Сваю дзейнасьць у гісторыка-археалягічнай камісіі Інбелкульту ён пачаў у 1925, асыстэнтам Смаленскага ўнівэрсытэту. З 1931 ён узначальваў сэкцыю археалёгіі Інстытуту гісторыі. Ляўдански таксама пасьпяхова працаваў у аддзеле археалёгіі Беларускага дзяржаўнага музэю, быў дацэнтам БДУ.

Расстраляны ў 1937 па абвінавачаньні ў шпіянажы на карысьць Польшчы.

палявых дасьледаваньняў, быў аўтарам шматлікіх археалягічных адкрыцьцяў. Пэрыяд з 1932 да 1936 гадоў быў напоўнены актыўнымі пошукамі і дасьледаваньнямі старажытнасьцяў на Дзьвіне, Дняпры і Сажы. Вядома, што ён сабраў матэрыял для археалягічнай карты паўднёвай Беларусі. Праца гэтая так і не дачакалася выданьня.

Да 1937 г. Каваленю міналі арышты і расправы, якія пачаліся ў Акадэміі навук у 1930 г. Сярод археолягаў першым зьняволілі Сяргея Дубінскага. Тады ж арыштавалі сяброў Кавалені: Мікалая Ўлашчыка, Сяргея Шутава. Напярэдадні, у жніўні 1929 г., Улашчык, Каваленя і Юзік Бараноўскі зьдзейсьнілі вандроўку на Лагойшчыну, навуковыя вынікі якой Каваленя апублікаваў у другім томе «Прац». Улашчык з нагоды таго падарожжа скрушна пазьней занатуе: «Ніхто з нас ня ведаў і не прадчуваў, што мы ідзем вольнымі людзьмі, можа, апошні раз па зямлі свае Бацькаўшчыны, не прадчувалі, што на доўгі час будзем адарваныя і кінутыя ў далёкія суворыя краі…»

Аляксандра Кавалену органы НКВД арыштавалі ў 1937 г. У архівах захаваліся паперы пра павышэньне заробкаў навукоўцам-археолягам. У сьпісе, які датуецца 28 траўнем 1937 г., пазначана імя малодшага навуковага работніка Аляксандра Кавалені, якому меркавалі павысіць стаўку з 313 рублёў 50 капеек да 425 рублёў. Імя Кавалені закрэсьлена чырвоным алоўкам. Яму вынесьлі прысуд 25 жніўня 1937 г., а 27 жніўня расстралялі, прыклеіўшы бязглуздае абвінавачваньне ў шпіянажы на карысьць Польшчы.

## Пра яго тэорыі спрачаюцца дагэтуль

У той жа дзень за той самы «шпіянаж» быў расстраляны адзін зь лідэраў беларускай археалёгіі Аляксандар Ляўдански. Кажуць, у НКВД прымушалі прызнацца яго ў тым, што ён, маўляў, шукаў і абазначаў на картах не старажытныя гарадзішчы і селішчы, а аэрадромныя пляцоўкі для польскіх аэрапланаў (!).

Асноўнай тэмай яго дасьледаваньня былі гарадзішчы — умацаваныя паселішчы жалезнага веку і раньняга сярэднявечча. Распрацоўваючы праблему зьяўленьня гарадзішчаў, этапаў іх разьвіцьця, Ляўдански прапанаваў адну з найбольш завершаных і дасканалых канцэпцый, якая дагэтуль абмяркоўваецца ў навуковай літаратуры. Менавіта ён, яшчэ ў 1926 г., услед за Сьпіцыным, абгрунтоўваў думку пра балцкую прыналежнасьць гарадзішчаў паўночнай, цэнтральнай Беларусі і Смаленшчыны. Паводле яго меркаваньня, славяне занялі ўзьведзеныя балтыйскімі плямёнамі гарадзішчы пазьней.

З акадэмічнага выдавецкага пляну вынікае, што на 1937 г. плянавалася выданьне археалягічнага зборніку «Дасьледаваньні ў басэйне Заходняй Дзьвіны» аўтарства Ляўданскага, Кавалені і Палікарповіча. Зразумела, зборнік ня выйшаў з друку — два яго аўтары былі залічаныя ў «ворагі народу». Ня быў надрукаваны і зьнік унікальны навуковы даваенны твор Ляўданскага і Палікарповіча «Нарысы па гісторыі даклясавага грамадзтва на тэрыторыі Беларусі».

Напэўна, у якасьці спадарожных, абцяжарваючых «віну» абставін Ляўданскаму закідваліся некаторыя факты яго біяграфіі. У прыватнасьці, службу на працягу двух гадоў у царскай арміі, выбыцьцё «за пасіўнасьць» з бальшавіцкай партыі.

## Адкрывальнік цэлай культуры

Ня менш трагічна склаўся лёс Сяргея Дубінскага, які прыйшоў у беларускую археалёгію ў 1925 г. як працаўнік гістарычна-археалягічнай камісіі Інбелкульту. Яшчэ ў Санкт-Пецярбурскім унівэрсытэце ён захапіўся археалёгіяй. Ужо ў студэнцкія гады ён атрымлівае дазволы на раскопкі ў сваім родным Бельскім павеце.

У 1926 — 1928 г. ён праводзіць, бадай, самыя пасьпяховыя свае раскопкі — вывучае Банцараўскае гарадзішча каля Менску, матэрыялы якога пазьней дазволілі вылучыць банцараўскую культуру. У 1933 г. была надрукаваная адна з найлепшых яго даваенных прац «Бібліяграфія па археалёгіі Беларусі і сумежных краін». Разам з тым не дачакалася выданьня складзеная ім археалягічная карта Магілёўскай губэрні.



**Сяргей Дубінскі**

нар. у 1884 у вёсцы Нарэйкі Бельскага павету Гарадзенскай губэрні ў сям'і сьвятара. Скончыў духоўную вучэльню, духоўную сэмінарыю ў Вільні. У Юр'еўскім ўнівэрсытэце вучыўся на мэдычным, гісторыка-філялягічным факультэце. Не задаволены якасьцю навучаньня, у 1908 перавёўся на гістарычна-філялягічны факультэт Санкт-Пецярбурскага ўнівэрсытэту. Захапіўся археалёгіяй. Пасьля ўнівэрсытэту працаваў настаўнікам у Вільні, ва Ўфімскай губэрні. З 1925 працаўнік гістарычна-археалягічнай камісіі Інбелкульту.

Расстраляны ў 1937 па абвінавачаньні ў шпіянажы на карысьць Польшчы.

# Расстраляная археалёгія



Другая палова 1920-х. На раскопках Бердыскай палеалітычнай стаянкі. Зьлева ўверсе — Аляксандар Каваленя.

Лёс гэтага рукапісу застаецца невядомым.

У 1930 г. Дубінскага арыштоўваюць першы раз у сувязі «зь ліквідацыяй «беларускага нацыянал-сацыялізму». Яго вызвалілі з-пад арышту, і ён змог нават аднавіцца на працы. Аднак, ацэньваючы палітычную сытуацыю ў Беларусі, ён разумеў, што перасьледы ня спыняцца. Яго, выхадца зь беларуска-польскага памежжа, народжанага ў сям'і сьвятара, захопленага ў студэнцкія гады ідэямі эсэраў, а цяпер зьвінавачанага ў «нацдэмаўстве», не пакінуць у спакоі. У 1933 г. ён едзе ў Санкт-Пецярбург і ўладкоўваецца ў Акадэмію гісторыі матэрыяльнай культуры. Вымушаныя ўцёкі ня выраталі. С.Дубінскі быў расстраляны органамі НКУС БССР у адзін дзень з Каваленем і Ляўданскім — 27 жніўня 1937 г.

Забойства Кавалені, Ляўданскага і Дубінскага, сыход у нябыт іншых дасьледчыкаў азначаў амаль поўнае вынішчэньне беларускай археалягічнай навукі. Пасьля вайны з слаўнай пляяды беларускіх археолягаў у навуцы застаўся толькі Канстанцін Палікарповіч. Страты павялічыліся вайной. Найкаштоўнейшыя археалягічныя калекцыі, якія захоўваліся ў Акадэміі навук і ў музэях краіны былі вывезеныя ў Нямеччыну. Зьнікла вялікая картатэка археалягічных помнікаў — матэрыял, падрыхтаваны да выданьня археалягічнай карты Беларусі. Зьнік унікальны фотаархіў. Толькі асобныя калекцыйныя матэрыялы, якія захаваліся ад тых даваенных раскопак і разьведак, знаходзяцца ў фондах Інстытуту гісторыі. У пакетах тых часоў і дагэтуль ляжаць вырваныя з блякнотаў аркушыкі, на якіх па-беларуску напісаныя назвы помнікаў і іх месцазнаходжаньне. Вельмі часта там жа можна знайсьці куды лепшай якасьці паперкі, на якіх беларускі тэкст перакладзены і старана напісаны панямецку. Гэта значыць, што калекцыі пабывалі ў нямецкім палоне. Падчас наступленьня фашыстаў на Менск археалягічныя калекцыі ўжо не было каму ратаваць…

## НОВЫЯ КНІГІ

**Маракоў Леанід. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асьветы, грамадзкія і культурныя дзеячы Беларусі:** энцыклапэдычны даведнік у 10–х тамах. Т. IV. Рэпрэсаваныя настаўнікі. Кн. 1. Абметка—Мяшальскі. **Мінск, 2007. — 440 с.**

Аўтар сабраў больш за тры тысячы біяграфій рэпрэсаваных настаўнікаў школ і вучэльняў. Зь іх быў расстраляны амаль кожны чацьвёрты. Усяго ў Беларусі было амаль 12 тысяч пэдагогаў. Вынікае, што рэпрэсавалі кожнага трэцяга.

З настаўнікаў 85% мелі сярэднюю адукацыю. Па тых часах, гэта былі вельмі адукаваныя людзі. Але яны, як аказалася, былі самымі небясьпечнымі для бальшавіцкага рэжыму.

«Энкавэдыст Быхоўскі па мянушцы «садыст» і іншыя ня менш адказныя таварышы падлічылі, што неабходна рэпрэсаваць кожнага чацьвёртага настаўніка, а рэпрэсавалі кожнага трэцяга — перавыканалі плян! Ніхто не хацеў рызыкаваць! Думалі, чым больш схопяць «ворагаў народу», тым лепш!», — піша ў прадмове Леанід Маракоў.

Шкада толькі, што наклад кнігі мізэрны. Толькі 50 асобнікаў.

**Ул. інф.**

# Апошні перад Скарынам

Пяцьсот гадоў таму перапісчык Мацей Дзясяты скончыў працу над першым у Беларусі поўным зводам кніг Бібліі. Гэта была справа геапалітычнай важнасьці. Піша гісторык **Мікола Нікалаеў.**



Ужо 15 гадоў у Расейскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу ладзіцца міжнародная навуковая канфэрэнцыя «Санкт-Пецярбург і беларуская культура». Сёлетняя была прысьвечана чалавеку, чыё імя памятаюць нешматлікія спэцыялісты. Аднак імя і праца кнігапісца Мацея Іванавіча (Мацея Дзясятага) вартыя ўсеагульнай памяці і прызнаньня. Бо ён — стваральнік першага ў Беларусі зводу кніг Бібліі, якому сёлета спаўняецца 500 гадоў. Той сьпіс кірылічнай славянскай Бібліі захоўваецца ў Санкт-Пецярбургу.

На пачатку XVI ст. на вялізнай прасторы Ўсходняй Эўропы быў толькі адзін поўны сьпіс біблійных кніг: Генадзеўскі. Створаны ён быў у Ноўгарадзе ў 1499 г. па блаславеньні архіяпіскапа Генадзя. Наяўнасьць поўнай Бібліі надавала Вялікаму Маскоўскаму княству (якое толькі далучыла Ноўгарад) аўтарытэт сярод хрысьціян.

Якраз у той час маскоўскі вялікі князь Іван III Васільевіч выдаваў дачку Алену за вялікага князя літоўскага Аляксандра Казімеравіча.

Падчас заручынаў Аляксандар абяцаў Алену шанаваць, а таксама не чапаць яе праваслаўнае веры. (Алена ж была ўнучкай бізантыйскага імпэратара!) Гарантамі слова князя-каталіка былі яго праваслаўныя падданыя.

Калі праз некалькі гадоў памёр брат Ян Альбрэхт, польскі кароль, Аляксандру перайшло ў спадчыну яго каралеўства. Новага караля ўрачыста каранавалі ў Кракаве. Аднак Алены на каранацыі не было — Папа і польскія паны былі катэгарычна супраць праваслаўнай каралевы. Алена Іванаўна засталася з тытулам вялікай княгіні.

Як вялізны недахоп кракаўскі двор разглядаў і адсутнасьць у Алены Іванаўны поўнага сьпісу Бібліі. У ВКЛ на той час зводу кніг Бібліі на славянскай мове не было: каб выканаць працу, трэба было зьбіраць, а часам і наноў перакладаць тэксты. Мець у дзяржаве поўны пераклад Бібліі было для праваслаўнай Літвы момантам прэстыжу. А для караля і вялікага князя такая кніга была б важкім аргумэнтам у палітычнай барацьбе зь цесьцем, вялікім князем маскоўскім. Вырашана было даручыць працу выдатнаму каліграфу Мацею Дзясятаму. Перапіска і аздоба задуманага кодэксу была скончаная праз пяць гадоў, у 1507 г.

### Дзесяць братоў — дзевяць манахаў

Пачатак гісторыі і біяграфія стваральніка вядомыя, дзякуючы захаванаму аркушу зь вялікай прыпіскай «Аб напісаўшым кнігі сія». Перапісчык паведамляе, што ён выхадзец з гораду Тарапца (у 1501 г. адышоў ад ВКЛ да Масквы), а быў ён дзясяты сын у сям'і (ад таго і названы Мацей Дзясяты). Усе дзевяць братоў прыйшлі ў манаства, манахінямі сталі і тры сястры.

Мацей з гонарам піша, што сярод іх — ігумен Прадцечанскага манастыра ў Полацку Яўфімі. На захаваным Полацкім Эвангельлі XIV ст. з манастыра Яна Прадцечы ёсьць укладны запіс, датаваны 1507 г.: «А прі том месьце былі добрые людзі ігоумнъ сьвятого Івана Еоуфімеі Таропка с брацією…» Прозьвішча прадцечанскага ігумена «Таропка» значыць «з Тарапца». Можна меркаваць, што праз брата Мацей быў знаёмы і з палачанінам Францішкам Скарынам: перакладчыкі біблійных кніг былі сучасьнікамі і людзьмі аднаго асяродзьдзя.

### Лебядзінымі пёрамі

Біблія Мацея Дзясятага — 545 аркушаў вялікага (30.7x19.5 см) фармату, яна ўключае Стары і Новы Запаветы. На кожнай старонцы 35 радкоў тэксту, упісаных так, што застаюцца шырокія палі. Палі занятыя шматлікімі паметкамі пісца і ўладальнікаў рукапісу ў пазнейшыя часы. Ва ўступе Мацей паведамляе, што гэтыя кнігі, падобна да пчалінага сота, «выкладзены ад усіх у адну».

Каліграфія «Дзесятаглава» ўражвае далікатнасьцю. Почырк Мацея не застаецца нязменным на працягу ўсёй пяцігадовай працы. Часам ён драбнейшы, часам больш грубы (памеры літар 2—3 мм). Гэта залежала ад якасьці атраманту, заточкі лебядзіных пёраў. Прыгожы почырк у спалучэньні з шырокімі палямі, раўнамернае чаргаваньне карычневага і чырвонага атраманту робяць вялікае эстэтычнае ўражаньне.

Мацей быў ня толькі выдатным дэкаратарам, але і выключна акуратным і граматным пісцом. Зробленыя пропускі і апіскі выпраўленыя альбо ў самім тэксце, альбо на полі з чырвоным вынасным значком. Артаграфія ў розных частках рукапісу адрозьніваецца, адпаведна артаграфіі розных кніг, выкарыста-

Працяг на старонцы 23.

# «Пісаў калгасьнік»

Пра што пісалі беларусы ў раённыя газэты ў 1939 г.? Аналізуе гісторык Віктар Лютынскі.



Нядаўна падчас рамонту гарышча аршанскай друкарні былі знойдзены ладны стос пажоўклых папераў. У асноўным гэта лісты чытачоў у рэдакцыю газэты «Ленінскі прызыў» (цяпер «Аршанская газэта»), што некалі тут месьцілася. Лісты датаваныя 1938—39 гадамі, чытэльныя, хоць выцьвіў атрамант. Улічваючы, што рукапісам амаль семдзесят гадоў, а поўнага камплекту газэты ў Беларусі няма, гістарычная каштоўнасьць іх несумненная.

Пра што ж пісалі чытачы ў раёнку ў той, ужо далёкі, час? Большасьць лістоў (з 31 — 18) — пра калгаснае жыцьцё, з чаго можна зрабіць выснову, што менавіта калгасьнікі былі галоўнымі чытачамі «ЛП». Зразумела, ня ўсе лісты, якія дасылалі вясковыя жыхары ў газэту, траплялі на яе старонкі. Дый тыя, што друкаваліся, часам непазнавальна перараблялiся супрацоўнікамі рэдакцыі. Таму нерэдагаваныя рукапісы даюць шмат цікавай інфармацыі пра сацыяльна-эканамічнае разьвіцьцё калгасаў, культурнае жыцьцё на вёсцы.

## Дзевяць тысяч лістоў у год

Калі знаёмісься зь лістамі калгасьнікаў, адразу ўспамінаецца прыпеўка, складзеная ў перадваенны час:

«У калгасе добра жыць —
адзін робіць, сем ляжыць.
А як сонца прыпячэ,
і апошні ўцячэ».

З 18 лістоў пра калгасныя справы толькі тры больш-менш станоўчыя (пра стаханаўцаў на вёсцы, своечасовую сяўбу і добрыя ўраджаі). Пра зьмест астатніх красамоўна гавораць іх загалоўкі: «Узьняць працоўную дысцыпліну», «Шкодніцтва», «Расхістаная дысцыпліна» і т.п. Назвы аўтарскія. Большасьць карэспандэнтаў падпісваліся ўласнымі імёнамі, некаторыя прасілі пры публікацыі падпісваць псэўданімамі (звычайна «Калгасьнік»).

Спрадвечная вера ў справядлівае і добрае вышэйшае начальства, якое, у адрозьненьне ад благога мясцовага, робіць усё чэсна і правільна, характэрна для тых калгасьнікаў. Давяралі і друкаванаму слову. Пра гэта сьведчыць і колькасьць лістоў, дасланых у газэту (яны пранумараваныя). Напрыклад, у 1939 г. іх было каля дзевяці тысячаў (для параўнаньня, цяпер мясцовая газэта атрымлівае прыкладна пяцьсот штук у год). Дый тое, што калгасьнікі не баяліся адкрыта крытыкаваць начальства (хаця, звычайна безвынікова), сьведчыць пакуль пра не задушаныя зусім парасткі калгаснай дэмакратыі і надзеі на лепшае жыцьцё.

## «А калі хто адважыцца крытыкаваць...»

У адрозьненьне ад сучасных СМІ тагачасныя газэты павінныя былі трымаць адваротную сувязь з усімі сваімі карэспандэнтамі. Так, напрыклад, рэдакцыя адказвала калгасьніку М.Пульянаву: «Паважаны таварыш! Ваша пісьмо аб тым, што старшыня калгасу Котаў узяў 300 кіляграмаў ільносемя, рэд. атрымала. Але ж зьмяшчаць яго на старонках газэты няма ніякай карысьці. Аб гэтым Вы напішыце лепш у калгасную сьценгазэту і потым патрабуйце, каб былі зробленыя адпаведныя захады».

Наіўныя журналісты! Пра адносіны да крытыкі «зьнізу» сьведчыць наступны ліст, які дазволю прывесьці амаль цалкам, бо апісаныя ў ім безгаспадарнасьць ня зьнікла і ў наступныя дзесяцігодзьдзі. Напісалі яго сем калгасьнікаў з калгасу імя Варашылава і назвалі яго «Злачынная бестурботнасьць». Праўда, у газэце артыкул зьявіцца пад больш лагоднай назвай «Бестурботнасьць у падрыхтоўцы да сяўбы». Зьмест яго наступны: «Злачынна зрываецца падрыхтоўка да вясны ў калгасе... Авёс зусім не сартавалі, а толькі перавеялі... Кладаўшчык Марчанка Малах выступаў супраць такога «сартаваньня» і даводзіў яго бескарыснасьць. Але старшыня калгасу Голубеў П. адказаў: «Не твая справа! Я кажу, добра будзе і так. Нас ніхто кантраляваць ня будзе»...

Рамонт інвэнтару праходзіць з рук вон дрэнна. Частка барон і плугоў адрамантаваная, а рэшта параскіданая дзе папала і завеяная сьнегам... Старшыня калгасу і інш. сябры праўленьня на пытаньні к-каў, чаму не рамантуецца інвэнтар, заўсёды адказвае: «А што, ці заўтра на поле паедзем? Пачакаем, пакуль сьнег растае. Вось тады сабяром усё і адрамантуем»...

Шкодніцкія адносіны да цяглавай сілы (да каня) назіраюцца штодзённа... Як старшыня, так і брыгадзір Старыкаў Гр. і іншыя сябры праўленьня штонядзелі езьдзяць па кірмашах на вельмі перагружаных конях, прычым часта не выпісваюць квіткоў, г.зн. дармова. У выніку коні вельмі худыя... Аўтамашына, якая маецца ў калгасе, пакінутая ў незамкнёным гумне без нагляду, і многа частак да яе расьцягнулі...

Аб усіх гэтых шкодніцкіх фактах ня раз пісалася ў насьценгазэце, але старшыня ніколі яе не чытае, і ніхто не рэагуе на яе. А калі хто адважыцца крытыкаваць бязьдзейнасьць і злачынства праўленьня, дык старшыня прыказвае брыгадзірам, каб такім не давалі коней для асабістых патрэб... Пануе зацiск самакрытыкі». Вынікі публікацыі гэтага ліста нам невядомыя, як, дарэчы, і астатніх.

## «Прашу прапусьціць мае заметкі як бы пабыстрэй»

Амаль усе лісты напісаныя па-беларуску, у некаторых бачныя сьляды тарашкевіцы. Але русыфікатарская палітыка ўладаў ужо давала свае вынікі, перш за ўсё ў горадзе. Усе лісты на расейскай мове (а іх усяго тры) менавіта з Воршы. Сярод іх ліст нейкага А.Васьпякова зь вершам «Юность поёт». Дарэчы, ліст той быў адпісаны загадчыку аддзе-

лу пісьмаў Яўгену Васілёнку (потым вядомаму пісьменьніку і журналісту). Ацаніўшы паэтычныя «вартасьці» верша, той напісаў на ражку аркуша «Дан вусны адказ». Верш празьмерна перапоўнены рыфмаванымі банальнасьцямі і напышлівасьцю. Не выратоўваюць яго і такія ідэалягічна выверaныя радкі:

«От чего наша юность поет
И сияет как майский восход?
С нами Сталин могучий поет
И народ за собою ведет
Сталин — радости юной певец,
Сталин — юности мудрый отец».

Але ад гарадзкой лірыкі зьвернемся зноў да суворай сялянскай прозы. Усе лісты калгасьнікаў пісаныя на аркушах са звычайных вучнёўскіх сшыткаў. Дый часам узровень пісьменнасьці і почырк сьведчыць пра тое, што рукі няштатных карэспандэнтаў больш прызвычаіліся да плуга ці пугі, чым асадкі і алоўка. Але яны вельмі хацелі бачыць сваё друкаванае слова на старонках газэты. Як прыпісаў адзін зь іх: «Дык прашу рэдакцыю «Ленпрызыву» прапусьціць мае заметкі як бы пабыстрэй. Прашу не адказваць. Пісаў заметкі Гарбачэўскі М. Пісаў калгасьнік».

## Чаму цяпер ня пішуць

Здаецца, і калгасы ў нас існуюць (перайменаваныя ў сельскагаспадарчыя вытворчыя кааперaтывы), нават ёсьць перадавыя гаспадаркі (у кожным раёне іх можна пералічыць на пальцах аднае рукі), і калгасьнікі (ці як іх цяпер называць?) яшчэ шчыруюць на палетках і фэрмах. Але вось іхных дапісаў аб працы і жыцьці ў сучаснай вёсцы на старонках мясцовага друку (прынамсі, «Аршанскай газэты») ня знойдзеш. Ці там усё так цудоўна: калгасьнікі своечасова атрымліваюць добрыя заробкі і мараць толькі пра рэспубліканскія «Дажынкі», дзе дзяржава шчодрай рукой раздае сельскім стаханаўцам кампутары і лядоўні? Ці пісаць развучыліся, бо вёска амаль пагалоўна сьпіваецца ад заможнага і шчасьлівага жыцьця?

Хутчэй за ўсё, віной таму тая абыякавасьць да працы і ўласнага лёсу, што апанавала беларускае сялянства (асабліва ва ўсходніх рэгіёнах краіны) у выніку калектывізацыі, якую небеспадстаўна назвалі «другой рэдакцыяй» прыгоннага права. А прыгонныя, як вядома, людзі бясправўныя ды бязмоўныя.

*Ворша*

# Апошні перад Скарынам

Працяг са старонкі 21.

ных для перапіскі. Царкоўнаславянская мова тэкстаў даволі чыстая, беларускія асаблівасьці рэдкія, але ёсьць. Большай часткай яны прарываюцца ў займеньніках: *табе*, *сабе*.

## На кантролі ў вялікага князя

Мацей паведамляе ў прыпісцы, што праца была пачатая «ў Вільні, пры вялікім князі Аляксандры, быўшым каралём Польскім, вялікім князем Літоўскім, Рускім, Жамойцкім, а мітрапаліце кіеўскім і Усяе Русі Іёне, а ваяводзе Віленскім Мікалаі Радзівілу...», а закончаная «ў манастыры Прачыстая Дабравешчаньня, называным Супрасьль у дзяржаве Аляксандра Хадкевіча». Заўважым: Мацей ставіць вялікакняскі тытул гаспадара на першае перад каралеўскім месца.

Далей Мацей паведамляе, што меў магчымасьць пачаць працу дзякуючы пісару вялікага княства літоўскага Фёдару. Згадка ў адным шэрагу пра вялікага князя і пісара, у якога Мацей для працы над кнігай «іспрасіх... от службы покоя», падаецца невыпадковай. Малаверагодна, каб пісар бязь ведама мітрапаліта і вялікага князя, у якога быў за сакратара, даручыў складаньне зводу біблійных кніг.

Хто ж быў той Фёдар? Верагоднай падаецца кандыдатура Фёдара Янушавіча, сына Янушка, які быў пісарам і каралеўскім сакратаром у 1486—1507 г. Фёдар названы «пісар былы» — ужываньне формы «былы» можна патлумачыць як паказаньне на тое, што чалавек яшчэ жывы, у адрозьненьне ад «кароль быўшы». Бо ў 1506 г., нечакана, ва ўзросце 46 гадоў, памірае вялікі князь Аляксандар (хадзілі чуткі, што ён быў атручаны). На пасад уступае Жыгімонт I, далёкі ад таго, каб падтрымліваць пачынаньні праваслаўных падданых.

Пасьля сьмерці караля Мацей Дзясяты, карыстаючыся апякунствам магната Аляксандра Хадкевіча, пераехаў у Супрасьльскі манастыр, каб закончыць кнігу. Магчыма, у той самы час, Мацей Іванавіч навучаў сына Хадкевіча — Рыгора Аляксандравіча, будучага стваральніка Заблудаўскай друкарні і апекуна Пятра Мсьціслаўца і Івана Фёдарава...



Вялікі князь Аляксандар.

КАРЦІНА ЯНА МАТЭЙКІ

## Ад Бібліі ўладароў да Бібліі мяшчанаў

Шыкоўны кодэкс заставаўся ў далёкім Супрасьлі, згубленым сярод Блудаўскай пушчы. У перапісе маёмасьці ад 1668 г. ёсьць «Дзесятаглаў з пуклямі медзянымі пазлацонымі». Пераплёт да нашага часу не захаваўся. У XIX ст. рукапіс вывез з Супрасьлю выкладчык Жыровіцкай сэмінарыі Павал Дабрахотаў, а ў 1911 г. кніга перайшла ў бібліятэку Пецярбурскай акадэміі навук.

Праз дзесяць гадоў пасьля Мацея Дзясятага Францішак Скарына Біблію надрукаваў. Перакладчыцкая і выдавецкая дзейнасьць Скарыны ажыцьцяўлялася для мяшчанаў і на іх сродкі: у прадмовах і пасьляслоўях ён толькі аднойчы ўспамінае сьвецкую і ні разу — царкоўную ўладу. Адзін гэты факт паказвае, наколькі розьніліся пазыцыі беларускага першадрукара і яго сучасьніка — кнігапісца.

Ужо шмат гадоў навукоўцы абмяркоўваюць пытаньне пра факсымільнае выданьне «Дзесятаглаву» — яно ня толькі забясьпечыла б унікальнай першакрыніцай гісторыкаў мастацтва і дасьледчыкаў славянскай бібліістыкі, але і ўпрыгожыла б любы бібліяфільскі кнігазбор цудоўным — каралеўскім — кодэксам эпохі Рэнэсансу. Пакуль жа пяцісотгадовы юбілей Бібліі Мацея Дзясятага адзначаны толькі малатыражным насьценным календаром, выдадзеным у Менску. Месца ў шэрагу факсымільных узнаўленьняў шэдэўраў кніг, якія бытавалі ў сярэднявеччы на беларускіх землях, пакуль не занятае.

# Гісторыя з Лукашэнкам на вокладцы

За кароткую сучасную гісторыю Беларусі шмат што зьмянілася. Толькі не памылкі, якія робяць палітыкі. Піша **Павал Вусаў**.

Часамі здаецца, што беларусы ішлі адной дарогай, а іх гісторыя — другой, і раптам, у канцы XX ст., іх шляхі сутыкнуліся. Тое, што адбылося ў Беларусі ў 90-я, сталася вынікам негістарычнасьці беларускага грамадзтва, страты гістарычнай памяці. Шлях пачынаецца ад асэнсаваньня сябе народам і ўваходжаньня ў гістарычнае быцьцё. Менавіта гэты працэс рушыў у пачатку 90-х.

Кожны народ перажываў трагедыі, якія фармавалі ягоную сьвядомасьць. Трагедыі беларусаў раней заўсёды былі часткай трагедыі іншых народаў: польскага, расейскага, «савецкага». Яны замацоўваліся ў супольнай памяці, але зьнікалі, калі зьнікалі адзіныя дзяржаўныя ўтварэньні. Толькі цяпер Беларусь і яе народ перажывае асабістую трагедыю, якая заключаецца ў панаваньні ўласнага аўтарытарызму, уласьцівага толькі беларусам. Народ цяпер адчувае на сабе яго сацыяльныя і палітычныя экспэрымэнты. І намагаецца супрацьстаяць яму.

Ня ўсе жыхары краіны ўсьведамляюць трагізм сытуацыі, шмат хто пэўны, што нічога дрэннага ў краіне не адбываецца, і гэтая сыстэма зьяўляецца найлепшай для Беларусі. Нічога дзіўнага — так разважала насельніцтва ўсіх аўтакратый. Так думалі і пры Сталіну, і пры Франка. Толькі пасьля крывавай палітычнай барацьбы, сацыяльных катаклізмаў расплюшчваліся вочы, і большасьць разумела, якіх ідалаў спараджаў сон розуму і чаго каштаваў гэты сон.

Усьведамленьне гэтага беларусамі стане гістарычным адкрыцьцём. У выніку адбудзецца асэнсаваньне свайго гістарычнага досьведу і фармаваньне гістарычнай памяці, якая ляжыць у падмурку сьпелага дэмакратычнага грамадзтва.

Сказаць, калі гэта адбудзецца, цяжка, але працэс пачаўся.

Матэрыяльным прадуктам гэтага асэнсаваньня сталася праца беларускіх палітолягаў, сацыёлягаў, гісторыкаў і юрыстаў, якая выйшла ў сьвет у форме кнігі пад назовам «Палітычная гісторыя незалежнай Беларусі».

«Палітычная гісторыя» сьведчыць пра дзьве рэчы. Па-першае, у Беларусі на працягу некалькі гадоў адбываліся падзеі (з гэтага пункту гледжаньня не істотна — добрыя ці благія), якія падкрэсьліваюць палітычнае і гістарычнае існаваньне Беларусі. А па-другое, у краіне ёсьць каму аналізаваць і асэнсоўваць гэтыя падзеі. Бяз гэтага асобныя падзеі засталіся б толькі падзеямі і ніколі б ня сталі гісторыяй.

Сямнаццаць гадоў ад здабыцьця незалежнасьці — яшчэ ня так шмат, каб тыя падзеі сапраўды сталі гісторыяй, але больш чым дастаткова, каб яны сьцерліся з памяці. Больш за тое, улада намагаецца зрабіць усё, каб аб некаторых здарэньнях недалёкага мінулага грамадзтва ня памятала ўвогуле.

Гісторыя ва ўсе часы станавілася ахвярай палітычных і ідэалягічных захадаў з боку ўлады, якая імкнулася зьмяніць яе на сваю карысьць. За апошнія гады гісторыя Беларусі, у тым ліку і сучасная, перацярпела некалькі «рэдакцыяў» і адпаведных ідэалягічных карэкціровак, у выніку стаўшы гісторыяй адной асобы.

«Палітычная гісторыя незалежнай Беларусі» — гэта, перш за ўсе, альтэрнатыўны погляд на палітычныя працэсы. На яе старонках можна знайсьці ня толькі сьмелыя выказваньні пра «палітычныя сцэнары», якія рэалізоўваюцца падчас выбараў, але і знайсьці інфармацыю пра «тайныя спружыны» палітыкі. Падобных тэкстаў ня знойдзеш у афіцыйных падручніках па ідэалёгіі і гісторыі.

Разам з тым, кніга дае чы-

Якім бы ні было стаўленьне да прэзыдэнта, ягоная фігура ключавая ў найноўшай гісторыі Беларусі, а ягоная дзейнасьць пакіне глыбокі сьлед у сьвядомасьці грамадзтва.



СЯРГЕЙ ГРЫЦ

**Дзейнасьць дэмакратычнай апазыцыі закладае асновы беларускай палітычнай традыцыі.**

тачу перадусім факты, на падставе якіх ён сам можа зрабіць уласныя высновы. Варта адзначыць, што хаця кніга і зьяўляецца «альтэрнатыўным поглядам» на сучасную гісторыю, яе нельга назваць праапазыцыйнай. Аўтары тэкстаў не сьпяваюць дыфірамбаў апазыцыі, паказваюць яе хібы, яе пралікі ў стратэгіі і тактыцы, якія ў значнай ступені адбіліся на сучаснай палітычнай сытуацыі ў краіне.

Некаторыя тэксты варта прачытаць, перш за ўсе, ня тым, хто цікавіцца палітычнай гісторыяй краіны, а лідэрам беларускай апазыцыі, якія спрычыніліся да гэтых гістарычных працэсаў і сваёй недасканалай стратэгіяй толькі падмацоўвалі рэжым Лукашэнкі.

Больш таго, апошнія палітычныя падзеі ў краіне падкрэсьліваюць той факт, што як «часовыя», так і «сталыя» лідэры апазыцыі ня толькі ня вучацца на сваіх памылках, а намагаюцца іх хутчэй забыць.

Сама тактыка і падыход да палітычнай барацьбы, як сьведчаць тэксты кнігі, за ўсе гэтыя гады амаль не зьмяніліся.

Шмат якія тэксты, прадстаўленыя ў кнізе, наводзяць на думку, што ні дзеючыя, ні былыя прадстаўнікі палітычнай эліты, якія пазьней увайшлі ў апазыцыю, ані сучасныя і тагачасныя дзеячы апазыцыі ня мелі дзьвюх вельмі важных якасьцяў: палітычнага прадбачаньня і гістарычнай адказнасьці.

Адсутнасьць першага не дазволіла палітычным дзеячам у самым пачатку разгледзець у Лукашэнку дыктатара. Адсутнасьць другога пазбавіла іх волі да аб'яднаньня, насуперак уласным амбіцыям, у адзіны фронт барацьбы супраць Лукашэнкі, калі ён узурпаваў уладу. За кароткую сучасную гісторыю Беларусі шмат што зьмянілася, але толькі не памылкі, якія робяць палітыкі.



**Беларускія палітыкі спачатку не разгледзелі ў Лукашэнку дыктатара.**

Падчас некаторых здарэньняў, якія вельмі добра і дэталёва апісаныя ў тэкстах кнігі (рэфэрэндум 1995 году, канстытуцыйны крызіс 1996 году, падпольныя прэзыдэнцкія выбары 1999 году), Лукашэнка рызыкаваў, каб узмацніць сваю ўладу, але менавіта ў тыя моманты ў апазыцыі і ў грамадзтва не знайшлося адзінай волі. Бязвольнасьць апанэнтаў толькі ўзмацняла волю да ўлады Лукашэнкі.

І аб гэтым гавораць аўтары тэкстаў «Палітычнай гісторыі». В.Булгакаў так акрэсьлівае палітычную стратэгію Лукашэнкі:

а) падтрымка ўнутранага крызісу і раздробленасьці апазыцыі, стварэньне псэўдаапазыцыйных сілаў,

б) трыманьне ў летаргічным палітычным сьне большасьці грамадзтва. Дзеля гэтага была створаная палітыка «сытасьці і спакою».

Лукашэнка вынік з палітычнай культуры беларусаў. Большасьць беларусаў нават не адчула таго, што яны былі свабодныя. Адбыўся працэс пераходу ад «савецкай палітычнай няволі» да беларускай палітычнай няволі». Зьмянілася форма гэтай няволі, але захавалася яе сутнасьць.

Як зазначае А.Екадумаў: «Постсавецкая Беларусь — спадкаемца масавага савецкага грамадзтва часоў БССР зь яго дзяржаўным атэізмам і пасьлядоўнай палітыкай разбурэньня традыцыйных інстытутаў». Сыходзячы з гэтага, можна сказаць, што беларускі народ быў асуджаны абраць на прэзыдэнта асобу, якой бы былі ўласьцівыя менавіта такія якасьці характару.

Чаму ж Лукашэнка мае такую здольнасьць утрымліваць уладу? Аўтары кнігі шукаюць адказу і на гэтае пытаньне. Варта адзначыць, што якім бы ні было асабістае стаўленьне да асобы прэзыдэнта і ягонай палітыкі, ягоная фігура ключавая ў найноўшай гісторыі Беларусі. Ягоная дзейнасьць пакіне глыбокі сьлед у сьвядомасьці грамадзтва і яшчэ доўгі час будзе адгукацца ў яго палітычнай будучыні.

На старонках «Палітычнай гісторыі...» можна знайсьці тлумачэньне мэханізмаў пабудовы аўтарытарнай сыстэмы. Як зазначае В.Сіліцкі: «Пасьля рэфэрэндуму 1996 году ў Беларусі зьнікла палітыка як працэс здабыцьця ўлады, які адбываецца ва ўмовах канкурэнцыі. У Беларусі з 1996 году палітыкай займаецца толькі адзін чалавек. Астатнія альбо спрабуюць здабыць адміністрацыйны ўплыў праз збольшага цырыманіяльныя палітычныя інстытуты (такія, як парлямэнт і выбары), альбо спрабуюць выкарыстаць цырыманіял як сродак піяр-кампаніі. Аднак пасьля кожнага электаральнага цыклу расклад сілаў застаецца нязьменным: палітыкай у беларускай дзяржаве і надалей займаецца адзін чалавек».

Кніга «Палітычная гісторыя незалежнай Беларусі» — фундамэнтальная праца, аснова для вывучэньня палітычных падзеяў, якія адбываліся ў Беларусі на пераломе стагодзьдзяў.




**Палітычная гісторыя незалежнай Беларусі. — Вільня: «Інстытут беларусістыкі», 2006. — 774 с.**



# Памяць вялікага землятрусу

Партугальскія археолягі раскрылі страшэнныя падрабязнасьці трагедыі 1755 г., якая зраўняла зь зямлёю Лісабон. Яны знайшлі самую вялікую брацкую магілу XVIII ст. З трох тысяч чалавек у ёй ня ўсе загінулі ад землятрусу. Многіх расстралялі, а некаторых... зьелі.

Раскопкі былі ахутаныя таямніцай. Афіцыйна апошнія тры гады археолягі вывучалі рэшткі францысканскага кляштару XVII ст. І толькі цяпер яны паведамілі, што насамрэч натрапілі на найбольшую брацкую магілу XVIII ст. У ёй ляжаць мінімум тры тысячы чалавек. Гэта ахвяры знакамітага лісабонскага землятрусу 1755 г., які зраўняў партугальскую сталіцу зь зямлёю.

Тая падзея і ў наш час трапляе ў шэраг выключных. Толькі ў 270-тысячным Лісабоне колькасьць ахвяраў ацэньваецца мінімум у 60 тыс. чалавек, у суседніх гарадах — 6—8 тыс., у гішпанскім гандлёвым горадзе Аямонце і навакольлі загінула ад цунамі 2 тыс. чалавек, да 8—10 тыс. загінулі ў адной толькі вёсцы ў Марока, што трапіла пад апоўзень. Ахвяры ў сельскай мясцовасьці Партугаліі і Афрыкі невядомыя.

Ролю ў маштабнасьці катастрофы адыграла і тое, што 1 лістапада — Дзень усіх сьвятых. І а 9.40 раніцы, калі горад скаланула, многія былі ў цэрквах.

Інстынкт пагнаў жывых ня з гораду, а бліжэй да вады — у надзеі сысьці на чоўнах у мора. Праз 20 хвілін, якраз калі на набярэжнай сабраўся натоўп, прыйшла першая хваля вышынёю 12—15 м. А затым новая лісабонская набярэжная абрынулася разам зь людзьмі.

А праз тры гадзіны пасьля разбуральных штуршкоў, ад адкрытага агню на кухнях і алтарах, пачаліся ўзгараньні, якія, дзякуючы моцнаму ветру і падпалам марадзёраў, хутка перарасьлі ва ўсеагульны пажар. Ён панаваў у горадзе пяць сутак.

Катастрофу адчула ўся Эўропа. Хоць эпіцэнтар, паводле сучасных геафізыкаў, знаходзіўся у акіяне — за 350 кілямэтраў у паўднёва-заходнім кірунку ад Лісабону.

Раскопкі магілы дакладна паказалі, які жах адбываўся на вуліцах гораду. І наколькі дакладна і зладжана спрацавалі ўлады краіны, асабліва дзяржсакратар маркіз дэ Памбаль, якому ўдзячныя лісабонцы паставілі помнік за выратавальныя працы. Гэта ён патлумачыў маладому каралю, што перад аднаўленьнем гораду трэба «пахаваць мёртвых і нагадаваць жывых», каб пазьбегнуць распаўсюду інфэкцыі, голаду, марадзёрства і панікі.

Цяпер стала зразумела, якія менавіта словы маркіза ўвасобіліся ў жыцьцё.

Перш за ўсё, у магіле археолягі знайшлі ня толькі рэшткі людзей, але і фрагмэнты жывёльных і рыбных костак, рэшткі глінянага посуду, ружанцы, мэдальёны і нават напарстак. Усе прадметы датаваныя гадамі, што папярэднічалі катастрофе. «Яны не адасаблялі целаў ад сьмецьця, усё скідалі ў адну кучу. Было не да сантымэнтаў», — кажа Жуан Луіз Кардоза, прафэсар археалёгіі з Адкрытага ўнівэрсытэту Лісабону.

Падчас працы з магілаю судовы дантыст з унівэрсытэту Лісабону Крыстына Пэрэйра апрацавала 1099 зубоў, што належалі ахвярам трагедыі. Выкарыстоўваючы стандартную працэдуру ідэнтыфікацыі людзей па гэтых рэштках, яна змагла «апазнаць» 79 чалавек, у тым ліку і немаўлят.

Узрост большасьці ахвяраў — ад 17 да 35 гадоў, з чаго навукоўцы зрабілі выснову, што ў зруйнаваных раёнах Лісабону большасьць жыхароў былі маладымі. І, мяркуючы па прыстойным стане зубоў, яны ня елі цукар, які самі ж партугальцы імпартавалі са сваіх калёній у Афрыцы і Бразіліі.

Затое стала зразумела, што тым, хто выжыў, не ўдалося пазьбегнуць голаду. Таму яны зразалі зь нябожчыкаў мяса і елі (сьляды разьдзелкі дакладна бачныя на некаторых рэштках).

Няшмат разабараліся экспэрты і з нацыянальным складам лісабонцаў XVIII ст. Яны знайшлі толькі адзіныя рэшткі чарнаскурай жанчыны. Затое раскапалі мноства прадметаў, якія выкарыстоўваліся для абмену на рабоў. Напрыклад, рэдкія марскія ракавіны. Гэтым раскопкі пацьвердзілі, што ў Лісабоне жылі рабы з партугальскіх калёній.

Таксама археолягі атрымалі мноства страшных доказаў разбуральнасьці землятрусаў. Паводле іх, «многія косткі пашкоджаныя, расьціснутыя і зламаныя ў некалькіх месцах. Відаць, гэтых людзей даставалі з-пад завалаў і як ёсьць скідвалі ў магілу. З чэрапу трохгадовага дзіцяці ўсё яшчэ выступае востры край каменя».

Аднак некаторыя з пахаваных памерлі не ад землятрусу. Іх расстралялі рэгулярныя войскі, выкліканыя ў горад для «зачысткі».

Хутчэй за ўсё, вайскоўцы атрымалі загад зьнішчыць усіх марадзёраў і параненых, кажуць археолягі. Таму што выратаваць іх усё адно не маглі. А калі б пачалася інфэкцыя, вымер бы ўвесь горад. Таму ў некаторых чарапах ёсьць адтуліны, якія можа пакінуць толькі куля.

Навукоўцы таксама знайшлі некалькі аплылых мэдальёнаў. Да іх прыліп амаль зашклянелы пясок. Такое магло здарыцца толькі пры вельмі моцным пажары з тэмпэратурай каля тысячы градусаў Цэльсія.

Пакуль удалося раскапаць толькі невялікую частку магілы. Адкрыты ўчастак разьмясьцілі пад шклом і выставілі на ўсеагульны агляд як памяць пра той страшны дзень.

# Шатляндыя: ці будзе незалежнасьць?



Тры стагодзьдзі мінула з таго часу, як была заключаная унія паміж Англіяй і Шатляндыяй. За гэты пэрыяд Шатляндыю прызвычаіліся ўспрымаць як неад’емную частку Вялікай Брытаніі. Шатляндцаў неаднойчы ставілі ў прыклад розным сэпаратыстам і нацыянал-радыкалам. Ідэоляг расейскага імпэрыялізму Мікалай Данілеўскі пісаў: «Шатляндцы ў іх [ангельцаў. — У.Ш.] — нязначнае нацыянальнае адценьне, як у нас велікаросы, маларосы, беларусы».

Англінізацыю шатляндцаў можна прасачыць на такім прыкладзе. Робэрта Бёрнза мы ведаем як шатляндзкага паэта. А Вальтэр Скот і Робэрт Льюіс Стывэнсан для нас — ужо ангельскія пісьменьнікі.

Сёньня ўсё часьцей гавораць пра тое, што Шатляндыя паварочваецца сьпінай да Англіі. Што ня сёньня заўтра сьцяг сьвятога Эндру можа зноў заняць сваё месца на мапе Эўропы. Што здарылася ? Чаго хочуць жыхары *«апошняй ангельскай калёніі»*, як называюць шатляндцы сваю краіну?

Пачынальніцай англа-шатляндзкай інтэграцыі можна лічыць Марыю Ст’юарт. Сваёй сьмерцю Марыя фактычна забясьпечыла сыну Джэймзу магчымасьць заняць ангельскі трон у 1603 годзе. Аднак спатрэбілася больш стагодзьдзя, каб аб’яднаць абодва каралеўствы.

Англа-шатляндзкі хаўрус 1707 году называюць *«шлюбам па разьліку»*. Галоўным яго матывам было жаданьне шатляндцаў далучыцца да эксплюатацыі ангельскіх калёній.

Шатляндцы шмат зрабілі для стварэньня Брытанскай імпэрыі. Дастаткова назваць такія імёны, як Дэвід Лівінгстан, Чарлз Гордан — першы губэрнатар Судану. Паўночнаірляндзкія пратэстанты, радэзійскі лідэр Ян Сміт, жыхары Фалклэндзкіх выспаў — таксама шатляндцы. Таму імпэрыялізм не ангельскі, а брытанскі. Актывізацыю шатляндзкага нацыяналізму, у сваю чаргу, зьвязваюць з заняпадам Брытанскай імпэрыі. Страціўшы былыя ўладаньні, Брытанія ператварылася ў *«хворага чалавека Эўропы»*, а Шатляндыя, як і Валія, і Паўночная Ірляндыя, трапіла ў лік *«дэпрэсіўных раёнаў»* з самымі вялікімі цэнамі на жыльлё, беспрацоўем і г.д.




Шатляндзкі нацыяналізм мае, найперш, эканамічна-сацыяльны характар, а Шатляндзкая нацыянальная партыя займае ў палітычным раскладзе левы флянг, што тыпова для нацыяналізму безьдзяржаўных народаў у Эўропе. Адзін зь яе заснавальнікаў Х’ю Макдыярмід напісаў у свой час на шатляндзкай гаворцы «Гімн Леніну».

Яшчэ адной асаблівасьцю шатляндзкага нацыяналізму зьяўляецца тое, што ён ня носіць культурна-этнічнага характару. Лідэры Нацыянальнай партыі падкрэсьліваюць, што шатляндцамі яны лічаць усіх, хто жыве на шатляндзкай тэрыторыі, нават усходніх мігрантаў.

Доўгі час ідэя шатляндзкай незалежнасьці не ўспрымалася ўсур’ёз. Сытуацыя зьмянілася, калі на ўзьбярэжжы Шатляндыі была знойдзеная нафта. «*Нам казалі, што для незалежнасьці мы занадта бедныя, цяпер аказваецца, што занадта багатыя»*, — жартуюць шатляндцы... Самым вялікім посьпехам шатляндзкага руху можна лічыць аднаўленьне ў 1998 годзе шатляндзкага парлямэнту. Аднак першыя выбары ў новы парлямэнт выйгралі лейбарысты. Сёньня сытуацыя адваротная.

Сярод прычынаў новага ўздыму нацыяналістаў называюць непапулярнасьць палітыкі Тоні Блэра ў Іраку, прыклад Ірляндыі, якую ўжо называюць «кельцкім тыграм». Шатляндцы незадаволеныя дзейнасьцю цяперашняга парлямэнту, які займаецца пераважна выданьнем розных забаронаў і пазбаўлены шэрагу важных функцый. Ён ня можа рэгуляваць замежную, іміграцыйную, фінансавую палітыку.

Што будзе, калі шатляндцы абвесьцяць сваю незалежнасьць?

Шатляндцы лічаць, што маюць найлепшыя шансы для ўваходжаньня ў ЭЗ, бо ў іх даўно дзейнічаюць эўрапейскія законы. Эўразьвяз, у сваю чаргу, баіцца, што шатляндзкі прыклад можа выпусьціць *«джына нацыяналізму»* ў Бэльгіі, Францыі, Італіі, ня кажучы ўжо пра Валію, Паўночную Ірляндыю.

Сьцьвярджаюць таксама, што шатляндзкія запасы нафты могуць неўзабаве і скончыцца.

Што пераможа: шатляндзкі гонар ці шатляндзкая практычнасьць? Пакажа недалёкая будучыня.

**Усяслаў Шатэрнік**



# Аджара

Вітрына Чарнамор'я. Бульвар у Батумі.

Працяг са старонкі 16.

астраномію, паэзію й прынёс самыя перадавыя на той час тэхналёгіі вытворчасьці й дойлідзтва.

Усе згодныя, што ўсходняе хрысьціянства — самая старажытная вера грузінаў, ад II ст., для Рэканкісты й злучэньня краіны нацыянальная грузінская царква была выключна важным чыньнікам, дзякуючы якому ацалела й мова й пісьменнасьць і сам нацыянальны дух, але пазьней іслам вярнуўся ў Аджару й ад XVI стагодзьдзя тут панаваў, што зусім не зашкодзіла аджарам захаваць сваю грузінскасьць.

Забраўшыся ў горную вёску, сеў пагутарыць з купкай тамтэйшых мэханізатараў. «А дзе ў Вас тут мячэт?» — пытаюся. Мае суразмоўцы на хвіліну прымоўклі, зьдзіўлена разглядаючы мяне. «А Вы знаёмыя з нашымі традыцыямі… Ну, там у нас толькі старыя цяпер». Ізноў жаданьня ўпусьціць у свой сьвет тубыльцы ня выявілі, прапанаваўшы пайсьці лепей за стол. Ну хоць бы кавы папіць!

Цяперашняя ўлада сьвядома хавае ісламскасьць Аджары. Вы ня знойдзеце інфармацыі пра тутэйшыя мячэты ні на турыстычных мапах, ні ў буклетах… Хоць пра хрысьціянскія цэрквы, нават пра самыя нязначныя, толькі што збудаваныя, абавязкова ёсьць указаньні. З аднаго боку, памкненьне Грузіі замацаваць сваю ідэнтычнасьць на мяжы зь вялізарнай Турцыяй, цалкам зразумелае, але зь іншага — гэта стварае комплексы.

На пытаньне, ці Вы аджар, сёньня можна пачуць: «Не! Я хрысьціянін!»… Аднак сьвініны ў рэстарацыях па-ранейшаму ня знойдзеш.

Летась была створаная Мусульманская дэмакратычная партыя Грузіі, што мае бараніць правы меншыняў, што вызнаюць іслам. Паводле іхных, неафіцыйных, ацэнак, такіх у гэтай краіне кожны чацьверты.

## Цёплы хлеб

Неад'емная частка рацыёну ў Аджарыі — цёплы хлеб, халодная вада й горнае паветра. Скажу шчыра, я добра схуднеў за час свайго падарожжа. Ежа ў Аджары вельмі смачная, але… лёгкая. Пікантны сыр — нятлусты, салата — ва ўласным саку, хлеб — праснак… Ні тлушчу, ні сьмятаны, ні масла… Але лазіць па гарах, купацца ў моры ці вадаспадах усё адно даводзілася.

## Стол пад вадаспадам

Вось гэтак прыблукаў пад вадаспад, што ў лесе, на краю мястэчка Махунцэці, а там чакаў… накрыты стол: віно, крынічная вада, хлеб, зяленіва. На чысьцюткім абрусе талеркі, шклянкі, збаны. Нейкі сон. Адпачыў ды пайшоў шукаць, каму дзякаваць. У выніку пазнаёміўся з тузінам людзей. Пачуў тузін гісторыяў. Хто ставіць той стол, не разабраўся. Але сэрца напоўнілася забытымі й прыгожымі пачуцьцямі. Як у юнацтве.

Першыя тосты ў Аджарыі заўсёды «За Бога і за мір». Тосты тут на дзіва прыгожыя й цікавыя. Выходзяць цэлыя прыпавесьці.

Дарэчы сказаць, за два тыдні нам не сустрэліся п'яныя людзі на вуліцах. Нідзе й ніколі ніхто тут ня будзе піць з рыльца на вачах у людзей. Дзясяткі тысячаў цьвярозых маладых людзей па вечарах танчаць, гуляюць у баскетбол ці футбол, купаюцца ў моры, мілуюцца на залітых агнямі батумскіх бульварах пад шатамі магноліяў.

## Унікальныя віны

За стагодзьдзі асманскага панаваньня грузіны-аджары, хаваючы ад ісламскіх уладаў свой вінаград у горных лясах, дасягнулі выбітных вынікаў. Адметнасьць



Вадаспад у Махунцэці. Пачостка для падарожных: хлеб, віно, вада, зяленіва.

тутэйшага вінаградарства — высотныя пляцістыя гатункі лазы. У Аджарыі расьце тузін тутэйшых гатункаў вінаграду, што не растуць больш нідзе: чхвэры, мекрэнчхі, цхэніс дзудзу, брола, сацуры, харыствала… Гонарам тутэйшых вінаробаў ёсьць Кедзкі вінзавод, дзе вырабляюць шэдэўр «Кедзкі цолікауры», зь дзіўным водарам ружаў. Тутсама вырабляюць унікальнае віно з тутэйшага гатунку чхавэры. Горцы лічаць яго лекавым і п'юць па каўтку. За савецкіх часоў пра тутэйшыя віны ведалі адзінкі. Цяпер іх зможа ацаніць кожны. Хто дабярэцца ў тыя далёкія горы…

Кухня ў Аджарыі, апроч агульнагрузінскіх брэндаў, кшталтам вострага, духмянага супа-харчо, пяшчотнага сацыві (заліўнога з арэхаў і курынага мяса), сачыстых хінкалі, мае шмат рэгіянальных адметнасьцяў. Гэта, перадусім, аджарскі хачапуры зь вясковае печы — пышны пірог з сырам, вяршкамі й яечняй, усьмятку ў сярэдзіне. Есьці гэта відэльцам немагчыма, толькі рукамі… А таксама барано з запечанага сыра, малака й яйкаў. І ачма — слаёны пірог з двума гатункамі сыру й галушкамі.

## Порта франка

Батумі пераўтвараўся ў вітрыну Грузіі. Пусьцілі ў паветра ўсё, што нагадвала тут пра савецкасьць: вялізарныя шэрыя спаруды гатэлю «Мэдэя» і вайсковага шпіталю, што займае вялікі квартал проста ў цэнтры гораду, помнікі Леніну й Сталіну ды драбнейшым катам. А вось дом-музэй Сталіна пакінулі, дзеля гістарычнае праўдзівасьці. Толькі цяпер у Батумі ёсьць і музэй Альфрэда Нобэля, які меў тут офіс. Ды яшчэ тузін выдатных музэяў і галерэяў. Хочаш паглядзець шкілет кіта ці карціну Пірасмані, унікальную антычную кераміку, што вылавілі ў тутэйшых водах — калі ласка!

Адзін з самых цікавых музэяў — музэй дойлідства Аджарыі пад адкрытым небам. Тут, у падсьветленых шкляных скрынях, як у акварыюмах, выстаўленыя макеты самых адметных спарудаў тутэйшых рэгіёнаў… Гледзячы на драўляныя санкі, пад пальмаю, прыгадваеш каляровыя расповеды горцаў пра свой сьнежны край…

Цяпер на краю горада расчышчаныя руіны крэпасьці Тамарцысхе, што была ўзьведзеная тут у X ст....

Пасьля бясконцае зьмены ўладаў у 1878 г. Батум далучылі да Расеі.

Горад імкліва вырас, дзякуючы бакінскай нафце. Менавіта з Батума нафту з Баку вывозілі на экспарт. Дзеля ажыўленьня бесперашкоднага гандлю тут існаваў рэжым porto-franco. То бок Батум меў



Горад-крэпасьць Гонiё. Лічыцца, што тут пахаваны апостал Матвей.

права бязмытнага ўвозу і вывазу тавараў. Гледзячы на тутэйшыя палацы й храмы, гэта можна лёгка ўявіць. Тут дзейнічалі консульствы асноўных эўрапейскіх дзяржаваў. І гэтая найпростая эўрапеізацыя не прайшла марна. Да сёньня тут дзейнічае славуты тэатар, унівэрсытэт, акіянарыюм, стары цырк, старасьвецкія рэстараны й кавярні.

Старадаўні бульвар, закладзены французамі ў XIX ст., да сёньня спраўна служыць. Дзеюць і славутыя некалі тытунёвая, чайная і… кафэінавая фабрыкі. Памкненьне быць эўрапейцамі тут агульнае. Нехта вывешвае сьцяг Эўразьвязу (часам і над дзяржаўнымі ўстановамі), нехта падкрэсьлена паліць францускія цыгарэты, а нехта перапявае італьянскія шлягеры.

Батумцы зьберагаюць кожную драбностку сваёй гісторыі: ад старых чыгунных парэнчаў да мэмарыяльных савецкіх таблічаў дзеячам культуры. На дамах, дзе ў 1918-1921 гадах былі консуляты Эстоніі, Украіны, Аўстрыі, цяпер зьмешчаныя мэмарыяльныя таблічы. Гэтак гістарычная памяць становіцца часткаю калектыўнае сьвядомасьці. Так, грузіны адчуваюць сябе эўрапейцамі!

## Маленькая Эўропа

І нешта пачынае мяняцца. Там, дзе была савецкая авіябаза — цяпер шыкоўны навюткі аэрапорт. За туркамі сьпяшаюцца армянскія, грэцкія, ізраільскія інвэстары. Толькі казахстанскія інвэстыцыі ў Аджарыю у 2004-2005 годзе склалі 30 млн даляраў, у 2006 — 200 млн!

Ва ўтульнай літаратурнай кавярні «Literataruli» замаўляем духмяную каву патурэцку й шклянку вады са льдом. За вакном душная паўднёвая ноч, што густа патыхае эўкаліптамі, лімонамі й морам. У кавярні-кнігарні — прахалода. Чалавек, зь якім гаворым, слухае ўважліва й добразычліва… Прынёс кавы. Спытаў, ці добрая. «А якія ў вас сёньня дэсэрты?» «Ня ведаю, ужо ноч… А я піяніст тут»,— адказаў ён і сеў за піяніна. П'ючы духмяную густую каву, згатаваную батумскім піяністам, разглядаючы букіністычныя кнігі на ўсіх мовах, думаецца не пра палітыку ці гісторыю культуры. І не пра клопат, што чакае нас у далёкім паўночным родным краі… Думаецца зусім пра іншае…

**Фота Веранікі Дзядок**



Бананы ў Аджары, што лапухі ў нас. Цень ад іх — добры паратунак у сьпёку.

# Бастыён не здаецца

Наведаўшы апошні бастыён сацыялізму — нязломную Карэйскую Народна-Дэмакратычную Рэспубліку, склаў сьпіс рэчаў, якія мяне найбольш уразілі. Піша **Лёлік Ушкін**.

## Мабільнікі ў мяху

Падчас памежнага кантролю пытаюць: ці ёсць мабільнкі? Аказваецца, карыстацца гэтымі апаратамі на тэрыторыі КНДР забаронена. Мабільнікі памежнікі забіраюць і акуратна кладуць у спэцыяльны мех. Потым яго адносяць на склад, які знаходзіцца проста на тэрыторыі аэрапорту. На зваротным шляху мабільнікі аддаюць. Яшчэ больш цікава паступаюць з ноўтбукамі. Са словаў тых, хто быў у КНДР неаднаразова, правозіць ноўтбукі дазваляюць, аднак потым, калі вас няма ў нумары, спэцыяльныя людзі з Камітэту прыходзяць і капіююць усю інфармацыю зь вінчэстэру.

## Стадыёны і шпіёны

Паспрабавалі неяк увечары зайсьці на стадыён, дзе дзяўчаты стукалі ў баскетбол. Салдат з аўтаматам, які стаяў на ўваходзе, перагарадзіў дарогу і знакам даў зразумець, што ўваход забаронены. «Усё ж КНДР ужо ня тая, што была пры Кім Ір Сэне,» — сказаў мне пасьля сябра, які бываў тут раней. Зь яго словаў, у Паўночнай Карэі назіраецца незвычайная палітычная адліга. Прыкладна дзесяць гадоў таму, калі ён спрабаваў прайсьці таксама на нейкі стадыён, вайскоўцы загналі яго штыкамі ў падсобку і ўсю ноч допытвалі як замежнага шпіёна. Толькі зранку куратары з арганізацыі, якая яго запрасіла, знайшлі небараку.

## Прыйшоў, пабачыў, прасьпяваў

Раніца ў Пхеньяне пачынаецца незвычайна. А пятай гадзіне з усіх рэпрадуктараў, якія ёсьць на кожным слупе, пачынаецца трансьляцыя нейкай мэлёдыі. Музыка незвычайная, кшталту авангардных кампазыцыяў Дэвіда Боўі. Пусты горад (тут настолькі чыста, што муніцыпалітэт нават ня траціцца на сьметніцы). Туман. Гучыць нейкая чумная музыка. Нагадвае галівудзкія фільмы пра зомбі.

Карэйцы — вельмі музычны народ. Уся адукацыя ідзе на аснове музычных твораў. Не адстае і партыйнае кіраўніцтва. Падчас візыту ў бункер, дзе ў час вайны знаходзілася стаўка паўночнакарэйскай арміі, паказалі месца, дзе вялікі правадыр у годзе 1952-м сустрэўся з найлепшымі байцамі з фронту. Сустрэча настолькі яго ўразіла, што ён проста на месцы склаў песьню пра іх подзьвігі і прасьпяваў яе. А на закуску яшчэ назьбіраў каштанаў і засунуў салдатам, якія маршыравалі на фронт, у кішэні.



## Дэфіцыт эўрапэоідаў

У мясцовым паўночнакарэйскім кінэматографе ёсьць вялікая праблема. Галоўным чынам тут здымаюць фільмы пра гераічную барацьбу байцоў Паўночнай Карэі з амэрыканскімі імпэрыялістамі ў 1950-я гады. Дык вось граць тых самых імпэрыялістаў няма каму: людзей з эўрапейскімі мызамі ў Карэі амаль няма. Калі існаваў Савецкі Саюз, праблема яшчэ неяк вырашалася за кошт усходнеэўрапейскіх і савецкіх студэнтаў, якія па абмене вучыліся ў мясцовых ВНУ. Цяпер на гэты конт поўны галяк. Даводзіцца карэйскіх акцёраў мазаць грымам і накладаць ім штучныя насы. Аднак дапамагае мала.

## Кім Ір Сэн і ўгнаеньні

Дзіўны форцель выкінула гісторыя зь нябожчыкам Кім Ір Сэнам. Трэба было ж такому адбыцца, што апошні раз ён зьявіўся на экране падчас нейкага прахаднога паседжаньня па пытаньнях угнаеньняў. Спачатку выслухаў чыноўнікаў, а потым, як і належыць, зрабіў усім канкрэтную галавамыйку. На наступны дзень генэралісімуса ня стала. Бедным карэйцам даводзіцца глядзець кожны дзень тую гістарычную нараду (яе ўвечары дэманструюць па тэлеку). Мяркую, што яны ўжо вывучылі на памяць кожную рэпліку прамовы Кім Ір Сэна і ня слаба прасунуліся ў вобласьці ведаў пра кампост.

## Паказуха па-карэйску

Прывезьлі на магілу аднаго зь першых каралёў Карэі. Магіла ўяўляе сабой курган і некалькі помнікаў побач. Адзін зь іх — у выглядзе вялікага мужчынскага органа: вяльможа меў больш за 20 жонак. Чамусьці побач з органам сябры сельскага каапэратыву з суседняй вёскі адзначалі слаўную гадавіну: роўна пяцьдзесят гадоў таму іх каапэратыў наведаў таварыш Кім Ір Сэн.

Мужчыны забойна танчылі адзін з адным пад нейкую папсу, а жанчыны рыхтавалі абед. Паглядзеў мэню. Няслаба жывуць мясцовыя калгасьнікі: крабы, крэвэткі, віно і г.д. Нават засмажылі сабаку з такой нагоды. Аднак потым спэцы па Карэі распавялі, што пабачаны намі сабантуй быў тыповай пацёмкінскай вёскай: так тут часта робяць, каб стварыць у інтурыстаў ілюзію пра тое, што пры Чучхэ ўсім зашыбенна жывецца.

## Лінія Кіма

Уразіў мэмарыяльны комплекс — лягер партызанаў атраду Кім Ір Сэна на поўначы краіны. Нас туды прывезьлі спэцыяльным самалётам. Лягер знаходзіцца ў лесе пад гарою Пэкту і ўяўляе сабой пяць-сем домікаў.

Цікавыя тры рэчы. Па-першае, як знайшлі лягер: быццам пры канцы 80-х была моцная бура. Яна паваліла ўсе дрэвы, і ляснічыя нечакана змаглі пабачыць гэтыя партызанскія зямлянкі. Па-другое, у лягеры ёсьць супэрэксклюзіў — надпісы, якія зрабіла жонка Кім Ір Сэна на ствалах соснаў у перапынку між баямі. Ствалы з надпісамі цяпер знаходзяцца ў гермэтычных шкляных кубах, напоўненыя спэцыяльным газам. Прыкол у тым, што якраз тут Кім Ір Сэн прачытаў вельмі экалягічную прамову пра тое, як важна клапатліва ставіцца да прыроды.

Нарэшце тут знаходзіцца домік, дзе, паводле афіцыйнай вэрсіі, у 1942 г. нарадзіўся Кім Чэн Ір. Між тым, перад сьмерцю яго бацька Кім Ір Сэн нечакана вызнаў, што ў гэты час ён ужо некалькі гадоў як жыў у СССР. Хто пісаў тыя лёзунгі на дрэвах, хто нарадзіўся ў гэтым доме і ад каго — незразумела, аднак комплекс працуе, як працаваў. Калі мы выяжджалі, туды прывезьлі цэлы грузавік піянэраў.




Мастак Уладзімер Цэсьлер на здымку Джэфа Баніфасіно.

# Баніфасіно ў Менску

Францускі фатограф Джэф Баніфасіно прэзэнтуе фотакалекцыю з Вольскім, Арловым, Вайцюшкевічам, нашаніўцамі.

У Галерэі Шчамялёва 15 жніўня адкрылася пэрсанальная выстава францускага фотамастака Джэфа Баніфасіно «Менск. Партрэты».

Джэф Баніфасіно здымае ва ўсім сьвеце. Беларусь прыцягнула фатографа як месца, дзе пульсуе жыцьцё, адбываюцца падзеі і людзі жывуць на лязе часу. Здымаў ён збольшага людзей культуры й мастацтва: артыстаў, інтэлектуалаў, танцораў.

Выстава прыедзе ў Менск з Парыжу, дзе экспанавалася ў галерэі «Халадзільнік».

Галерэя Шчамялёва знаходзіцца на праспэкце Ракасоўскага, 49 (Серабранка).

## КАНЦЭРТ

### За вышыванку — 5 тыс. зьніжкі

23 жніўня ў клюбе «Step» (вул. Прытыцкага, 62) пройдзе фолькфэстываль «Crivia aeterna: Архаіка і сучаснасць». Бяруць удзел: «Moon far away» (Расея), «Pragnavit», «Osimira», «Essa», «Svalbard», «Tod geheim». Кошт квіткоў 20 тыс. руб., наведнікам у народных, сярэднявечных і гатычных строях — 15 тыс. руб. Даведкі: (029) 646–64–97, 708–31–91.

## ВЫСТАВЫ

### Лянкевіч у Дрэздэне і ў «Падземцы»

У Нямеччыне да 6 верасьня працуе пэрсанальная выстава фатографа «НН» Андрэя Лянкевіча «Фокус на Беларусі». Здымкі фотажурналіста — вытрымкі зь беларускай штодзённасьці: «простыя» людзі ў вёсках, міліцыянты на вуліцах, незалежныя мастакі, моладзь, незадаволеная сучаснасьцю, і мінулае, якое ніяк ня хоча сысьці ў нябыт.

Месца правядзеньня выставы: Kulturverein riesa efau, Adlergasse 14, 01067 Dresden.

20-га жніўня а 18-й у артхаус-галерэі «Падземка» (пр.Незалежнасьці, 43) — адкрыцьцё фотавыставы Андрэя Лянкевіча «Living with Art», якая будзе працаваць да канца месяца.

### Уладзімер Кандрусевіч

У мастацкай галерэі ЛаСандр-арт (Раманаўская слабада, 24) працуе выстава Ўладзімера Кандрусевіча. Ніводны сумленны літвін ня мусіць прапусьціць! Хіба хто бачыў мастака-беларуса, які б маляваў Цуд Сьвятога Казімера пад Полацкам у 1518 г., або абраз сьвятой Цэцыліі, патранэсы касьцёльнай музыкі, або літвінскую ідылію XIX ст. — «Калдуны графа Тышкевіча»?

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Зорны пыл»

**Зорны пыл** (Stardust)

ЗША — Вялікабрытанія, 2007, каляровы, 130 хв. Рэжысэр: Мэцью Вон

Рамантычная казка паводле кнігі Ніла Гэймана

Адзнака: 7 (з 10)

Аднойчы малады чалавек праз правал у вясковым муры трапіў у чароўную краіну, дзе пазнаёміўся зь пекнай служанкай ведзьмы. Праз дзевяць месяцаў юнаку падкінулі сына... Вясковага недарэку й зьнічку чакаюць прыгоды з адзінарогам, паветранымі піратамі і чараўніцтвам. Але самае галоўнае — выпрабаваньне сэрца…

Карціна Мэцью Вона — рамантычная казка з кананічным вясельлем пры канцы. Стужка далёкая ад сур'ёзнасьці «Гары Потэра» і раскошы «Піратаў», культавай баявітасьці «Конана» — і зубастасьці «Шрэка».

«Зорны пыл» — фантазія з надрыўнымі мыльнаопэрнымі інтанацыямі. Эмоцыі — наіўныя і дыдактычныя; героі — ганаровыя казачныя маскі. Зло ёсьць зло, дабро ёсьць дабро. І ўвесь фільм нейкі разбэрсаны.

Але ў гэтым і асалода.

Быццам трымаеш у руках зачытаную дзіцячую кніжку. Яна й неахайная, і нязграбная, і недасканалая — але самая любімая. Бо гаворыць сэрцам.

Цырк-шапіто, кірмашовыя атракцыёны… сьпяшайцеся, пакуль не забыліся на сваё дзяцінства.

А вось дзеці могуць глядзець фільм гадоў з дванаццаці. Ведзьмы страшныя, дый прынцы добрымі манерамі не вылучаюцца.

«Зорны пыл» — нечаканы летні падарунак для гледача. Калі вы здольныя быць наіўнымі, каб яго ацаніць.

**Андрэй Расінскі**




# ГІСТОРЫЯ Ў «НН»

*Жнівень 2007*


**Расстраляная археалёгія.**
Піша Мікола Крывальцэвіч ........ 18

**Апошні перад Скарынам.**
500 гадоў першаму ў Беларусі поўнаму зводу Бібліі.
На той час то была рэч геапалітычнай важнасьці.
Піша Мікола Нікалаеў ........ 21

**«Пісаў калгасьнік».**
Пра што пісалі беларусы ў раённыя газэты ў 1939 г.
Піша Віктар Лютынскі ........ 22

**Гісторыя з Лукашэнкам на вокладцы.**
Рэцэнзія Паўла Вусава на «Палітычную гісторыю
незалежнай Беларусі» ........ 24

**Памяць вялікага землятрусу** ........ 26


## ФАТАФАКТ




СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ

**У Менску на сьмецьцевых кантэйнэрах таямніча зьявіліся надпісы тарашкевіцай.**

## КАЛІ Б...

**...усе ягоныя прамовы вывучалі ў навучальных установах.**



МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

— Пятрова, паглядзі ў шпору: зь імем каго зьвязана ня ўсё толькі дрэннае...

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**М.Гальшаны Ашмянскага у.** Ад рускага насяленія ад чатырох воласьцей выбраны гальшанскі поп, прадсядацель з Саюзу рускага народу і яшчэ адзін такі самы мужык. Адным словам, папісаліся мужыкі! Ад нярускіх мужыкоў выбралі добра, усе як адзін падалі галасы за Пятра Савіцкага, левы, стаіць за свабоду, і Ігната Прыгодзкага, таксама добрга беларуса.

**Ф.**

**«НН». №30. 1907**





# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста падпішыце дамову. Дэталі — **старонка 17.**


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КВАТЭРЫ

**Тэрмінова прадаецца** 2–пакаёўка ў Дзяржынску. 4–ы паверх цаглянага 5–павярховіка (1995 г.п.), плошча 47 кв.м, 27 —жылой, кухня 7,6 м. Зашклёны гаўбец, лічыльнікі, падвал. Блізка чатыры крамы, школа, прыпынак. Дзіцячы садок у двары ля пад'езду. Прыгожы краявід з вакна , недалёка возера Дзягільна. За 50.500. Т.: 701–62–70, 33–810–53, (017)205–77–48.

**Беларуская моладзь** з таварыства «Этна» здыме двух–ці трох пакаёўку ў старым доме (да 1960 г. ) у Менску. Шкодных звычак ня маем. Т.: 029–704–00–18 (Раман)

### ШУКАЮ ПРАЦУ

**Хлопец 18 год**, студэнт–завочнік, шукае сталую працу. Т.: 572–28–38. Аляксей

### ВІТАНЬНІ

**9 жніўня** знакамітаму гісторыку і журналісту Янку Запрудніку споўніўся 81 год. Віншуем!

**8 жніўня а. Аляксандру Надсану** споўніўся 81 год. Моцнага здароўя і творчага плёну, вам Ойча! Сто год! Здароўя, аптымізму, творчага плёну ды ажыцьцяўленьня новых праектаў. Жыве Беларусь!

### СПАЧУВАНЬНІ

**Шчырыя спачуваньні Валеру Булгакаву** і ягонаму роду ў сувязі з трагічнай сьмерцю ягонага дзядзькі **Вінцэнта Шашкевіча**. Хай будзе яму івянецкая зямля пухам. Сябры


# Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф–рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
заснавальнік Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»



**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**.


Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 15.08.2007.

Замова № 4445.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.